Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 КАСТРЫЧНІКА 2017 г. АЎТОРАК №195 (28559)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Па слядах «вогненных экспертыз»**

СТАР. 7



**«Страчаныя аблічча» – у Літаратурным музеі Купалы**

СТАР. 9



**Навошта чакаць гіпертанічнага крызу?**

СТАР. 11

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір СЯМАШКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Валавы ўнутраны прадукт Беларусі па выніках 2017 года вырасце на запланаваныя 1,7%. Хачу нагадаць, што за 8 месяцаў гэтага года тэмп росту ВУП склаў 101,5%. Прамысловая вытворчасць вырасла на 5,5%. На жаль, па выніках года некалькі ўпадзе сельскагаспадарчая вытворчасць — да ўзроўню 102—102,3%. Але затое крыху вырастуць лічбы па будаўніцтве. Я вельмі вітаю палітыку Нацыянальнага банка, таму што мы істотна знізілі стаўку рэфінансавання».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.10.2017 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9755 ▲ |
| Еўра | 2,3170 ▲ |
| Рас. руб. | 0,0338 ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0745 ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ЖУРАВІНЫ НА ЖАДАХ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Толькі восенню на балоце Жады бывае людна. А прычынай таму — журавіны. Сотні аматараў зарабіць на журавінах добрыя грошы выпраўляюцца на балоты. Яны выкарыстоўваюць кожны пагодны дзянёк, але і непагадзь ім не перашкода — усё роўна ідуць за некалькі кіламетраў — па вадзе, па багне, па сфагняку — у самае сэрца балота, дзе багата пунсовых ягад.**

СТАР. 4

■ Свая справа

## АДЧУЦЬ ДУШУ ЖЫВОЙ ПРЫРОДЫ

### Як карэнныя гараджане пераехалі ў вёску, стварылі аграсядзібу і заапарк

**Дыктафонную гутарку з Юрыем і Наталляй КАПТЫШАМІ праслухоўваю не першы раз галоўным чынам з-за таго, што наш дыялог адбываецца на фоне розных птушыных і звярыных галасоў. Весела кукарэкаюць пеўні, бубняць індыкі і качкі, а лісы (ніколі б не падумала) заводзяць песні накшталт катоў. У гэтым бадзёрым шматгалоссі адчуваецца нейкая ўрачыстасць жыцця, нешта сапраўднае. І я, здаецца, пачынаю разумець Юру і Наталлю, хоць ніколі не была фанатам жывёльнага свету, не вельмі любіла наведваць заапаркі. Так было, прынамсі, раней. Пакуль не трапіла ў Дэколы...**

### Спачатку была курыца

Дык вось пра нашых герояў. Яны абое выраслі ў Баранавічах, скончылі школу, атрымалі прафесіі і працавалі ў даволі вялікім горадзе. Там нарадзіліся іх дочкі Алівія і Дамініка. Юрый быў зарэгістраваны як індывідуальны прадпрымальнік, займаўся продажам машын. Наталля яму дапамагала. У нейкі момант, паводле слоў жонкі, ад стомленасці і гарадскога тлуму захацелася цішыні, адасобленасці: каб прачнуцца ранкам і адразу перад табой — лес, каб сонца насустрач і поўныя грудзі паветра.

Яны купілі дом у Дэколах, на ўскрайку вёскі. Прырода тут сапраўды рэдкай прыгажосці. Векавыя сосны і бярозы — адразу за агароджай. Цяпер грыбы, кажуць, збіраюць за варотамі ўласнай сядзібы. А тады прыязджалі сюды выхаднымі проста адпачываць. Не садзілі нават ніякага агарода, як робяць сапраўдныя дачнікі. І каб хто ім сказаў у той час, што неўзабаве прададуць кватэру і пераедуць сюды назусім, пэўна, пасмяяліся б.

СТАР. 4

■ Ведай нашых!

## КРАІНА ПРЫГАЖУНЬ

### Беларуска перамагла на конкурсе «Міс свету на інваліднай калясцы»

**На сусветным конкурсе прыгажосці, які праходзіў у Варшаве, мінчанка Аляксандра Чычыкава заняла першае месца. У спаборніцтве за карону яна абышла 23 дзяўчыны.**



Дагэтуль у конкурсах прыгажосці Аляксандра не ўдзельнічала, але на гэтай «Міс» вельмі хацела перамагчы. «Ты выходзіш не проста пакрасавацца. Шмат дзяўчат на калясцы ўпадаюць у дэпрэсію і думаюць, што ніколі не будуць мець сям'ю, што ніводзін хлопец на іх не зверне ўвагу. Я змагу стаць прыкладам і паказаць, што жыццё з-за інваліднасці не заканчваецца», — расказала дзяўчына ў інтэрв'ю «Звяздзе» за 31 жніўня.

Аляксандры 23 гады. Яна працуе ў кол-цэнтры і паралельна вучыцца ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М. Танка на псіхолага — сацыяльнага педагога. А ў вольны час іграе ў тэатры.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

# КІРУНКІ СУПРАЦОЎНІЦТВА ВЫЗНАЧАЕ ЧАС

## Кіраўнік дзяржавы сустрэўся з міністрам абароны Азербайджана

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, вітаючы Закіра Гасанава, міністра абароны Азербайджана, генерал-палкоўніка, прызнаўся: прыемна сустрэцца з кіраўніком абароннага ведамства гэтай краіны не толькі як з «ваенным чалавекам», прадстаўніком сяброўскай Беларусі арміі, але і як з пасланцом яго добрага сябра і калегі Ільхама Аліева.**

— Я папрашу перадаць яму самыя добрыя пажаданні. Думаю, у найбліжэйшы час мы сустрэнемся, у нас будзе магчымасць пагаварыць на розныя тэмы, — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што Беларусь і Азербайджан працягваюць супрацоўнічаць у тым ліку ў ваенна-тэхнічнай сферы.

— Не хачу ні перад кім апраўдвацца, які характар носіць наша супрацоўніцтва, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Хачу толькі сказаць адно, што нашы адносіны ні ў якім разе не парушаюць ні адзін міжнародны дагавор, ні адну рэзалюцыю Савета Бяспекі ААН... Мы суверэнныя незалежныя дзяржавы, і мы ў праве вызначаць тыя кірункі супрацоўніцтва, якія адпавядаюць духу часу, запытам нашых дзяржаў.

Беларускі лідар успомніў тыя часы, калі абедзве дзяржавы ўваходзілі ў склад Савецкага Саюза:

### ❍ У тэму

**Генерал-палкоўнік Закір ГАСАНАЎ, міністр абароны Азербайджана:**

— Азербайджан і Беларусь — вельмі блізкія і сяброўскія краіны. Ва ўсіх абласцях ідзе супрацоўніцтва. У ваеннай сферы яно таксама развіваецца вельмі імкліва. Гэта пытанні і абмену вопытам, і ваеннага будаўніцтва, і, безумоўна, ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва. Апошняе мы ацэньваем вельмі высока. Узброеныя сілы Азербайджана карыстаюцца ўзбраеннем і тэхнікай вытворчасці Рэспублікі Беларусь. З поўнай адказнасцю міністра абароны заяўляю: гэта высакаякаснае ўзбраенне.

— Да грамадзян Азербайджана ў нас увогуле ніякіх прэтэнзій няма. Мы з вялікай павагай ставімся да іх. Самае галоўнае, пра што я вельмі добра памятаю: у цяжкія часы ваш Прэзідэнт заўсёды падстаўляў плячо беларускай дзяржаве. Мы гэта ўсё вельмі добра памятаем, і мы гатовы, калі зможам нешта зрабіць для Азербайджана, гэта зрабіць — для таго, каб ваш народ жыў у бяспецы, каб дзяржава развівалася, а Азербайджан, яго народ, быў паспяховай дзяржавай, каб даходы насельніцтва раслі. Мы будзем ставіць сабе толькі гэтыя высакародныя мэты.

Па словах Прэзідэнта, умацоўваць абарону — гэта натуральна і неабходна, для таго каб Азербайджан адчуваў сябе гэтак жа спакойна, надзейна.

— Мы разам з вамі працуем у гэтым плане і будзем працягваць працаваць, — запэўніў кіраўнік дзяржавы.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■

## ■ Парламенцкі дзённік

# Грамадскія арганізацыі ратуюць прыроду



**Іх вялікую ролю ў гэтым пытанні адзначыла Таццяна КАНАНЧУК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы. Яна расказала, што «на сёння менавіта дзякуючы грамадскім арганізацыям, такім як «Ахова птушак Бацькаўшчыны», «Багна» і іншым, робіцца вельмі шмат для захавання ландшафтнай і біялагічнай разнастайнасці ў нашай рэспубліцы».**

У 2010 годзе ў Беларусі плошча прыродных тэрыторый, якія асабліва ахоўваюцца, складала 7,7% тэрыторыі краіны. Сёння гэта лічба падрасла да 8,6%. У планах давесці яе да 8,8% — гэта міжнародны паказчык, які характарызуе добрую ўстойлівасць ландшафтнай і біялагічнай разнастайнасці. Такія планы былі агучаны падчас круглага стала «Захоўванне біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці як складнікаў устойлівага развіцця», які прайшоў у Палаце прадстаўнікоў. Яго правялі ў рамках падрыхтоўкі законапраекта аб прыродных тэрыторыях, якія асабліва ахоўваюцца.

Таццяна Кананчук, чыя камісія непасрэдна распрацоўвае гэту ініцыятыву, растлумачыла, што новая рэдакцыя будзе адпавядаць тым глабальным экалагічным выклікам і антрапагенным нагрузкам, з якімі сёння сутыкаецца прырода. «Функцыянаванне асабліва ахоўных прыродных тэрыторый — гэта вельмі важны момант, таму што менавіта на іх ствараюцца ўмовы для таго, каб не зніклі віды дзікіх жывёл, дзікарослых раслін, для таго, каб функцыянавалі нашы экасістэмы», — адзначыла старшыня камісіі.

Удасканаленне заканадаўства датычыцца не толькі новага законапраекта: напрыклад магчымае ўнясенне пэўных змяненняў і ў Лясны кодэкс. У рамках круглага стала прапанавалі разгледзець новую класіфікацыю прыродных тэрыторый, якія асабліва ахоўваюцца. Да таго ж, як адзначыла Таццяна Кананчук, вельмі важна захаваць баланс: не нашкодзіць біяразнастайнасці і развіваць выкарыстанне тэрыторый, напрыклад, як аб'ектаў экатурызму.

Прыцягненне партнёраў да заканатворчай дзейнасці ў справе аховы прыроды дае магчымасць абмяняцца вопытам па розных пытаннях. Напрыклад, дырэктар грамадскага аб'яднання «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Аляксандр Вінчэўскі расказаў, што ў Літве існуюць заказнікі, дзе ахоўваюцца менавіта глебы: яны больш за стагоддзе не былі закрануты чалавечай дзейнасцю. У Беларусі на сёння няма ні аднаго такога заказніка.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

# Дэпутаты накіраваліся ў Страсбург

**З 9 па 12 кастрычніка там праходзіць пасяджэнне Камісіі ПАСЕ па палітычных пытаннях і дэмакратыі.**

У яе рабоце ад нашай краіны прымаюць удзел член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і навуцы Алена Анісім і старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Андрэй Навумовіч. Дарэчы, ён таксама з'яўляецца кіраўніком рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па вывучэнні праблематыкі смяротнага пакарання як інструмента пакарання, які ўжываецца ў нашай дзяржаве.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Турцыя прыпыніла выдачу неіміграцыйных віз амерыканцам



Турэцкі ўрад адказаў на рашэнне ЗША прыпыніць выдачу неіміграцыйных віз ва ўсіх дыпмісіях на тэрыторыі Турцыі, распарадзіўшыся зрабіць тое ж самае ў консульскіх установах Турцыі на амерыканскай тэрыторыі. Адпаведную заяву распаўсюдзіла ў Twitter турэцкае пасольства ў Вашынгтоне. «Апошнія падзеі вымусілі ўрад Турцыі перагледзець абавязацельствы ўрада ЗША ў сферы бяспекі для супрацоўнікаў дыпмісій Турцыі. Наша пасольства і консульства прыпынілі выдачу неіміграцыйных віз, каб паменшыць колькасць наведвальнікаў, пакуль праводзіцца гэты перагляд», — адзначаецца ў дакуменце.

### Улады ў Багдадзе не выключаюць стварэння канфедэрацыі з іракскім Курдыстанам

Адпаведная прапанова была ўхвалена некаторымі палітычнымі фракцыямі ў парламенце і ўрадзе Ірака. Федэральныя ўлады Ірака не выключаюць стварэння канфедэрацыі з іракскім Курдыстанам для выхаду з палітычнага крызісу, выкліканага рэферэндумам аб незалежнасці курдскай аўтаноміі. Такое сцвярджэнне ўтрымліваецца ў артыкуле, апублікаваным у газеце Asharq Al-Awsat. Як заявіў выданню член Савета палітычнага кіраўніцтва іракскага Курдыстана Абдала Вараці, «прапанову аб стварэнні канфедэрацыі перадаў трэці бок, які прадстаўляе суседнія дзяржавы», ініцыятыва «была ўхвалена некаторымі палітычнымі фракцыямі ў парламенце і ўрадзе Ірака», але «афіцыйна прадстаўлена не была».

### Еўрапол можа ўпершыню ўзначаліць жанчына

Еўрапейскае паліцэйскае ведамства ўпершыню ў яго гісторыі можа ўзначаліць жанчына — бельгійка Катрын Дэ Боль, паведамілі ў прэс-службе Europol. Міністрам унутраных спраў краін — членаў Еўрасаюза належыць да канца года прыняць рашэнне аб прызначэнні новага выканаўчага дырэктара Europol у сувязі са сканчэннем мандата брытанца Роба Уэйнрайта, які займае гэтую пасаду з 2009 года. Іншымі кандыдатамі на пасаду выканаўчага дырэктара паліцэйскага ведамства ЕС, па звестках дыпламатычнай крыніцы РІА Навіны ў Брусэлі, з'яўляюцца галандзец Віл Ван Гемерт і чэх Олдрых Марціну.

### Пампеі будуць здаваць у арэнду



Арганізаваць канцэрт у антычным тэатры Пампей або спартыўны турнір у амфітэатры гэтага музея пад адкрытым небам — зусім хутка такое будзе магчыма. Італьянскія ўлады прапануюць здаваць помнікі аднаго з самых наведвальных месцаў краіны ў кароткатэрміновую арэнду. Кошт залежыць ад тыпу мерапрыемства і памеру будынка — так, канцэрт у вялікім антычным тэатры абыдзецца ў 15 тысяч еўра. Такім чынам мяркуецца сабраць грошы на ўтрыманне музея, унесенага ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Адзінае выключэнне — заяўкі на правядзенне ў Пампеях вяселляў і юбілейных урачыстасцяў прымацца не будуць.

# УМОВЫ ДЛЯ САМАЗАНЯТАСЦІ

### Гаспадары аграсядзіб змогуць ладзіць банкеты, а рамеснікі — прадаваць свае творы ў майстэрнях

**Работа па стымуляванні дзелавой актыўнасці і выключэнні залішніх патрабаванняў, што прад'яўляюцца да суб'ектаў гаспадарання, праводзіцца ў краіне па даручэнні кіраўніка дзяржавы. У яе рамках падрыхтаваны і падпісаны Прэзідэнтам два новыя ўказы — «Аб развіцці аграэкатурызму» і «Аб ажыццяўленні фізічнымі асобамі рамесніцкай дзейнасці», паведамляе прэс-служба беларускага лідара.**

Указ №365 «Аб развіцці аграэкатурызму» замацоўвае права грамадзян, якія пражываюць у сельскай мясцовасці і маюць зямельныя ўчасткі, прадастаўленыя для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома, займацца аграэкатурызмам без змены мэтавага прызначэння гэтых зямельных участкаў. Раней аказваць паслугі ў сферы аграэкатурызму маглі выключна грамадзяне, якія маюць у карыстанні зямельныя ўчасткі, прызначаныя для вядзення ўласнай падсобнай гаспадаркі.

Суб'ектам аграэкатурызму даецца права аказваць шырокі шэраг дадатковых паслуг, спадарожных тэматыцы віду дзейнасці, у тым ліку праводзіць прэзентацыі, юбілеі, банкеты.

Жылы дом, неабходны для размяшчэння гасцей, згодна з Указам, можа належаць як непасрэдна грамадзяніну, які аказвае паслугі ў сферы аграэкатурызму, так і членам яго сям'і. Пры гэтым таксама допускаецца ўзвядзенне гасцявых домікаў, якія не падлягаюць уключэнню ў жыллёвы фонд.

Указам №364 «Аб ажыццяўленні фізічнымі асобамі рамесніцкай дзейнасці» максімальна пашыраецца пералік відаў рамесніцкай дзейнасці, якія грамадзяне маюць права ажыццяўляць па заяўным прынцыпе без дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў. У названы пералік уключаны ўсе віды творчасці, якія ажыццяўляюцца на аснове ручной працы.

Удакладняюцца месцы і спосабы рэалізацыі рамеснай прадукцыі. Акрамя продажу сваіх вырабаў на рынках, кірмашах і ў іншых месцах, вызначаных мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, рамеснікі змогуць прадаваць свае вырабы непасрэдна ў майстэрнях, дастаўляць і перасылаць прадукцыю пакупнікам па ўказаным ім адрасе.

Рамеснікі таксама змогуць рэкламаваць сваю прадукцыю, у тым ліку ў інтэрнэце.

## ■ Класныя навіны

# КАЛІ ПАСТАВЯЦЬ КРОПКІ НАД «І»?

**Ці захаваюцца ўступныя экзамены ў гімназіі? І ўвогуле, ці захаваюцца самі гімназіі? Гэтыя пытанні не на жарт хвалююць бацькоў сённяшніх чацвёртакласнікаў.**

Як паведаміла прэс-служба Міністэрства адукацыі, у галоўным адукацыйным ведамстве абмяркоўваліся механізмы рэалізацыі канцэпцыі развіцця сістэмы агульнай сярэдняй адукацыі на найбліжэйшы час. Удзел у абмеркаванні ўзялі намеснік прэм'ер-міністра нашай краіны Васіль ЖАРКО, міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА, прадстаўнікі абласных упраўленняў адукацыі, дырэктары школ і гімназій. Сярод іншых разглядалася і пытанне аб адмене ўступных экзаменаў у 5-я класы гімназій.

— Сёння дзеці, якія паступаюць пасля чацвёртага класа ў гімназіі, атрымліваюць стрэс і не разумеюць, навошта ім гэта трэба. Я лічу, што ўсе павінны мець роўныя ўмовы для атрымання адукацыі, — падзяліўся сваім бачаннем сітуацыі Васіль Жарко. — Для агульнай сярэдняй адукацыі таксама актуальная праблема працоўнага выхавання дзяцей і падлеткаў. Гэта пытанне не павінна выпадаць з поля зроку бацькоў і педагогаў.

Па словах міністра адукацыі Ігара Карпенкі, як від установы адукацыі гімназія захаваецца. «Яна будзе рэалізоўваць праграму пачатковай, базавай і агульнай сярэдняй адукацыі, пры гэтым аб павышаным узроўні мы павінны весці размову ў дачыненні да вучняў 10—11 класаў», — лічыць Ігар Карпенка. Таксама дэталёвай прапрацоўкі патрабуе пытанне аб незалежным экзамене за курс базавай школы. Міністэрствам сумесна з кіраўнікамі ўстаноў адукацыі і педагогамі будуць прапрацаваны ўсе гэтыя пытанні і толькі пасля гэтага прыняты адпаведныя рашэнні.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■

# Лесу – чысціню

**Акцыя «Чысты лес» прайшла ў краіне. Усяго ў ёй прымала ўдзел каля 30 тысяч чалавек.**

Асаблівую ўвагу яны ўдзялілі ачыстцы лесу паблізу населеных пунктаў. Акрамя таго, у асобных рэгіёнах краіны займаліся пасадкай дрэваў замест тых, якія не прыжыліся або засохлі.

— Адметна, што людзі сталі апошнім часам значна больш цывілізаванымі. Калі яны пакідаюць лес, то ў большасці свай прыбіраюць за сабой смецце, — адзначыў **першы намеснік міністра лясной гаспадаркі Аляксандр КУЛІК.**

Адным з цэнтраў акцыі стаў лясны фонд, размешчаны ўздоўж другой МКАД. Там працавалі як цэнтральны апарат Мінлясгаса, так і падведамныя арганізацыі. Яны навodзілі парадак на 200 гектарах тэрыторыі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

## «Міру» — 25 гадоў

**Міждзяржаўная тэлерадыёкампанія «Мір» святкуе свой 25-гадовы юбілей. Віншаванне калектыву тэлерадыёкампаніі накіраваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.**

«Гэты маштабны медыяпраект, што адпавядае духу часу, аб'ядноўвае таленавітых, ініцыятыўных прафесіяналаў, якія любяць сваю справу, шануюць лепшыя традыцыі і высокія стандарты журналістыкі. Асвятляючы ўсе грані грамадска-палітычнага, эканамічнага, культурнага і спартыўнага жыцця Садружнасці, вы ўносіце значны ўклад ва ўмацаванне дружбы і ўзаемнага даверу паміж нашымі народамі», — гаворыцца ў віншаванні.

Прэзідэнт адзначыў, што за мінулую чвэрць стагоддзя тэлерадыёкампанія набыла адданую шматмільённую і шматнацыянальную аўдыторыю не толькі ў Садружнасці Незалежных Дзяржаў, але і далёка за яе межамі.

Калектыў «Звязды» далучаецца да ўсіх віншаванняў і жадае калегам натхнення, плёну і новых творчых здзяйсненняў!

■ Надвор'е

## ХАЛОДНЫ ВЕЦЕР З БАЛТЫКІ

**Даволі ветрана і дажджліва будзе ў нас на працягу працоўнага тыдня, паведамляюць у Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У Гідрамецэнтры паведамілі, што на працягу тыдня ў Беларусі будуць гаспадарыць атмасферныя франты і халодныя паветраныя масы, якія паступаюць з Балтыйскага мора. У аўторак атмасферныя франты прынясуць на большую частку тэрыторыі краіны дажджы, якія будуць суправаджацца парывістым ветрам. Тэмпература паветра ўдзень — не вышэй за 6—11 цяпла. Халадна і мокра чакаецца і ў сераду, калі захаваецца дажджлівае з парывістым ветрам надвор'е. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 2 да плюс 8 градусаў, удзень — 7—13 цяпла.

У чацвер чакаецца частковая змена надвор'я, якое стане больш няўстойлівым, але ўдзень у паўднёвых раёнах крыху пацяплее. Уначы ў асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы. Удзень прыйдзе чарговая сістэма атмасферных франтоў, якія змяшчаюцца з Заходняй Еўропы, яна выкліча на большай частцы тэрыторыі краіны дажджы. Захаваецца парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 2 да плюс 8 градусаў, удзень — 8—14 цяпла, а на поўдні краіны паветра прагрэецца да 16 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

## Аварыя на пераездзе

**У нядзелю а шаснаццатай гадзіне на нерэгулюемым пераездзе побач са станцыяй Юшкевічы пад Баранавічамі адбылася аварыя з удзелам двух цягнікоў і грузавіка, што перавозіў буракі.**



Прычэп грузавіка МАЗ спачатку сутыкнуўся з цеплавозам цягніка № 652 Брэст—Мінск, ад удару яго выкінула на суседнія пуці, дзе на прычэп наехаў цягнік №607 Мінск—Брэст. Самае галоўнае, што ў аварыі ніхто не пацярпеў. Кузаў да сутыкнення паспеў праехаць пуці, таму ўдар прыйшоўся на прычэп.

Як паведаміў **афіцыйны прадстаўнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей МАШНОЎ**, у выніку аварыі цеплавозы абодвух цягнікоў атрымалі механічныя пашкоджанні. Спатрэбіўся час, пакуль байцы падраздзялення Баранавіцкага гараддзела МНС з дапамогай бензарэзаў выбівалі фрагменты прычэпа і ачысцілі пуці. Затым цягнік №652 быў адбуксіраваны на станцыю Пагарэльцы для замены цеплавоза. Цеплавоз сустрэчнага цягніка замянілі на станцыі Баранавічы-Палескія. Такім чынам, затрымка руху першага састава склала 3 гадзіны 54 мінуты, другога — 4 гадзіны 45 мінут. Не дзіва, што да позняга вечара ў гэты дзень цягнікі прыбывалі ў Мінск са спазненнем. Праваахоўныя органы праводзяць праверку здарэння.

Нешта многа апошнім часам аварый здараецца на нерэгулюемых пераездах, хоць яны і аснашчаныя светлавой і гукавой сігналізацыяй. Яшчэ на памяці страшная аварыя ў Іванаўскім раёне з гібеллю дзяцей... Вадзіцелі насуперак здароваму сэнсу выбіраюць рызыку. Няўжо трэба паўсоль вяртацца да шлагбаумаў?

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■

■ Жніво-2017

# ХЛЕБАРОБАМ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

**Пахмурнае надвор'е ў Клічаве ў мінулую суботу цалкам кампенсавалася шчаслівымі ўсмешкамі тых, каму вобласць абавязана караваем вагой у 1 мільён 176 тысяч тон. Менавіта столькі сёлета было намалочана збожжа сельскагаспадарчымі арганізацыямі Магілёўскай вобласці — на 150 тысяч тон больш, чым летась. А з улікам усіх катэгорый (фермеры, насельніцтва) — 1 мільён 240 тысяч тон.**



Фота БЕЛТА.

Найлепшыя камбайнеры, аграномы, кіроўцы і ўсе тыя, хто прыклаў свае намаганні для атрымання такога важкага ўраджаю, былі адзначаны добрымі словамі і ўзнагародамі. Прадстаўнікі 21 раёна вобласці прайшлі ўрачыстай калонай па цэнтральнай вуліцы абноўленага да свята горада. Павіншаваць іх з дасягненнямі ва ўборцы збожжавых прыехалі кіраўніцтва вобласці на чале са старшынёй аблвыканкама Уладзімірам Даманеўскім, намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Міхаіл Русы, іншыя высокапастаўленыя госці, дэпутаты, ветэраны і Героі Сацыялістычнай Працы, дэлегацыі Бранскай вобласці Расіі, розныя рэгіёны Беларусі.

Найлепшых вынікаў па вытворчасці збожжа з аднаго гектара сельгасугоддзяў дасягнулі Шклоўскі, Магілёўскі і Хоцімскі раёны. А найбольш высокага валавога збору збожжа (больш за 100 тысяч тон) — хлебаробы Шклоўскага, Магілёўскага, Горацкага і Мсціслаўскага раёнаў. Лідарамі па ўборцы сярод сельскагаспадарчых арганізацый сталі «Агракамбінат «Зара» Магілёўскага раёна (намалочана больш за 30 тысяч тон збожжа пры ўраджайнасці 90 ц/га) і ААТ «Александрыйскае» Шклоўскага раёна (38 тысяч тон пры ўраджайнасці 77,5 ц/га).

Горад прымаў удзельнікаў і гасцей свята багатымі гандлёвымі радамі, інтэрактыўнымі і канцэртнымі пляцоўкамі, спартыўнымі спаборніцтвамі і відовішчнымі прадстаўленнямі. Шмат было танцаў і спеваў у народным стылі. Клічаў не шкадаваў апладысментаў артыстам Магілёўскай абласной філармоніі і зоркам беларускай эстрады, з задавальненнем сняваў разам з Анатолем Ярмоленкам і яго заслужаным калектывам «Сябры». Сімвал клічаўскага свята — «Рог дастатку» — быў усталяваны на Цэнтральнай плошчы горада напярэдадні Дажынак. Яго аўтар — знакаміты магілёўскі скульптар Андрэй Вараб'ёў.

А ў гарадскім парку яшчэ да пачатку асноўнай праграмы фестывалю-кірмашу быў адкрыты памятны знак ваенным журналістам Магілёўшчыны.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# УЗНАГАРОДЫ — ЛЕПШЫМ, НАСТРОЙ — ДЛЯ ЎСІХ

**На Міншчыне падвялі вынікі сельскагаспадарчага года на абласным свяце «Дажынкі», якое прайшло ў Смалявічах. Аграрыі цэнтральнага рэгіёна забяспечылі чвэрць валавога збору па краіне і занялі другое месца па ўраджайнасці. Па выніках абласнога спаборніцтва пераможцам стаў Дзяржынскі раён, а лідарам па ўраджайнасці — Нясвіжскі: больш як 65 цэнтнераў на круг.**



Фота БЕЛТА.

— Міншчына многія гады ўтрымлівае славу галоўнай жытніцы краіны. Цяперашняе жніво праходзіла ў складаных умовах, выпрабоўваючы нас на трываласць. Але рэгіёну ўдалося дасягнуць выніку амаль у два мільёны тон. Гэта — заслуга нашых людзей, — падкрэсліў **старшыня Мінаблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА** пры ўручэнні ўзнагарод хлебаробам.

Сярод камбайнераў роўных няма Міхаілу Саладуху з агракамбіната «Ждановічы», які намалаціў 5816 тон збожжа. Гэта найлепшы вынік у Беларусі. Сёлетняе жніво для Міхаіла юбілейнае — дваццатае па ліку. А вось стаж у трактарыста-машыніста Віталя Куніцкага з філіяла «Праўда-Агра» адкрытага акцыянернага таварыства «Агракамбінат «Дзяржынскі» значна меншы. Але Віталь здолеў заняць першае месца ў адпаведнай намінацыі. Лепшым сярод кіроўцаў стаў Іван Трафімовіч (ААТ «Казловічы-Агра»), сярод маладых кіроўцаў — Дзмітрый Акульскі з ААТ «Палачаны». Узнагароды з рук губернатара атрымалі таксама спецыялісты, аграномы, інжынеры. Анатоль Ісачанка адзначыў уклад у агульны каравай і работнікаў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, міліцыянераў, якія забяспечвалі парадак падчас уборкі і захавання ўраджаю.

Старшыня аблвыканкама заўважыў, што сёлетнія «Дажынкі» паспрыялі далейшаму развіццю райцэнтра. Менавіта да свята было прымеркавана адкрыццё Палаца шлюбу пасля рэканструкцыі. Да гэтай значнай падзеі работнікі наладзілі выставу архіўных дакументаў, якія захаваліся, дзякуючы мясцоваму святару.

У новым Палацы прайшла першая рэгістрацыя немаўляці, якое нарадзілася 27 верасня. Бацькам Дар'і — Аляксею і Ірыне Місілевіч ва ўрачыстай абстаноўцы ўручылі пасведчанне аб нараджэнні дачкі. Анатоль Ісачанка павіншаваў шчаслівых сужэнцаў і ўручыў ім падарунак.

Старшыня Мінаблвыканкама разам з дэлегацыяй абышоў таксама імправізаваныя падворкі, якія здзіўлялі сваім аздабленнем у мясцовых традыцыях, багатымі пачастункамі. Сваю прадукцыю прывезлі на кірмаш 200 суб'ектаў гаспадарання. Пакупнікам прапаноўвалі зніжкі, разнастайныя акцыі.

На свяце можна было паспаборнічаць з сапраўднымі шахматнымі гросмайстрамі. Прычым партыі разыгрываліся пернікавымі фігурамі. Аматары пеннага напою дэгуставалі новыя гатункі піва на смалявіцкім Актобарфэсце. Варта было наведаць і «Горад майстроў», набыць цікавую непаўторную рэч ручной работы, а на праваслаўнай выстаўцы-кірмашы — царкоўныя прылады, кнігі. Манастырская лаўка прапаноўвала прадукцыю асабістай вытворчасці: мёд, выпечку, гародніну, малочныя прадукты.

На працягу дня працавалі сцэнічныя пляцоўкі, дзе выступалі аматарскія творчыя калектывы. Інтэр'актыўныя пляцоўкі ўстаноў прафесійнай адукацыі дэманстравалі экспанаты дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і тэхнічнай творчасці, выкананыя ў розных тэхніках.

Закончылася мерапрыемства ў 20.30 святочным феерверкам.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

■

■ Напярэдадні

## ДЭЛЕГАТЫ ХВАЛЮЮЦЦА ПЕРАД СОЧЫ

### Але гатовы прэзентаваць сваю Беларусь з найлепшых бакоў

**Старшыня Мінгарвыканкама Андрэй ШОРАЦ перадаў сцяг Мінска сталічным дэлегатам XIX Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў. Урачыстая цырымонія сімвалічна прайшла ў гарадской ратушы. Сцяг з рук кіраўніка мінскага выканаўчага камітэта прыняў першы сакратар мінскай гарадской арганізацыі БРСМ Сяргей КЛІШЭВІЧ.**

Андрэй Шорац выказаў упэўненасць у тым, што маладыя людзі добра прадставяць сталіцу і ўсю Беларусь на форуме. «150 краін і 20 тысяч удзельнікаў — гэта глабальна, прыгожа і прэстыжна. Я хацеў бы каб вы прэзентавалі эканамічны, турыстычны, культурны патэнцыял нашага горада. Нагадалі ўсім, што ў 2019 годзе ў нас будуць праходзіць Еўрапейскія гульні. Каб вы запрасілі ўсіх наведаць нашу цудоўную краіну», — сказаў мэр беларускай сталіцы.

Хваляванне і жаданне прадставіць сябе і Беларусь з найлепшага боку, здаецца, ахопліваюць усіх дэлегатаў Сусветнага фестывалю. Перад будучай паездкай яны падзяліліся сваімі эмоцыямі.

**Студэнт педагагічнага ўніверсітэта Сяргей ТАБОЛІЧ:**

— Я чакаю, што знайду людзей, якія навучаць мяне чамусьці новаму, у першую чаргу звязанаму з сферай маіх інтарэсаў. Унікальнасць сітуацыі ў тым, што гэта можна зрабіць на міжнародным узроўні.

**Прадстаўнік федэрацыі прафсаюзаў Дзяніс ФАЛЬКОВІЧ:**

— Чакаю свята маладосці і яркіх уражанняў на міжнароднай платформе, дзе збяруцца самыя яркія прадстаўнікі моладзі. Спадзяюся на новыя знаёмствы, абмен досведам, думаю, што ў дэлегатаў будуць літаральна разбягацца вочы ад усіх платформаў і гутарак, магчымасцяў для ўдасканалення ў розных кірунках.

**Старшы выкладчык кафедры тэлебачання і радыёвяшчання Інстытута журналістыкі БДУ Лізавета ХМЕЛЬ:**

— Ганаруся тым, што маю кандыдатуру выбралі на такое прэстыжнае мерапрыемства. Самае важнае для мяне — расказаць пра нашу краіну. Якая яна выдатная, колькі ў нас магчымасцяў для людзей у плане рэалізацыі сябе як студэнтаў, выкладчыкаў. Мне хацелася б падзяліцца сваім вопытам і расказаць, наколькі важная для нашай краіны вышэйшая адукацыя і як цікава быць студэнтам. Таксама мне хацелася б расказаць, што ў Інстытуце журналістыкі БДУ ў нас мноства магчымасцяў для рэалізацыі свайго творчага патэнцыялу. Мне хацелася б даведацца, як праводзіцца навучальны працэс у розных краінах, каб узяць нешта новае і, магчыма, укараніць у нашу сістэму адукацыі або на сваіх лекцыях.

**Намеснік дырэктара беларускай лігі інтэлектуальных каманд Вадзім КУЗЬМІЧ:**

— Ад Сочы чакаю новых знаёмстваў. Хачу даведацца пра тое, як адукацыя развіваецца ў Расіі і ва ўсіх краінах свету. Мне цікава інтэграваць у працэс адукацыі новыя інтэлектуальныя метады, каб павялічваць эфектыўнасць гэтага працэсу для дзяцей. У інтэлектуальных гульнях гэта можна вельмі добра арганізаваць. Хачу пераняць вопыт іншых краін.

Нагадаем, што XIX Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў пройдзе з 14 па 22 кастрычніка ў Сочы.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■

# АДЧУЦЬ ДУШУ ЖЫВОЙ ПРЫРОДЫ



Любімцы гаспадара — альпакі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Але аднойчы з іх пасмяяліся знаёмыя, якія гасцявалі ў Каптышаў: «Маўляў, якія вы вясковыя гаспадары, калі ў вас нават яйка дамашняга няма?» І Юра тады пайшоў на рынак, купіў дзясятак курачак. З іх усё і пачалося, згадвае гаспадыня. Найперш зазірнулі ў інтэрнэт, знайшлі рэкамендацыі па гадоўлі свойскай птушкі. Даглядалі курэй, кармілі і неўпрыкмет сталі заўважаць, што ім цікава мець справу з перыстымі жывымі істотамі. Вырашылі завесці курэй іншых парод, якіх бачылі па тэлевізары. Ну і пайшло: цяпер у іх каля дзясятка відаў розных курэй. Адна такая маленькая квактушка тэпала каля вальера з куранятамі...

І якая зараз дастаткова. Ёсць ужо нават і качыныя, і страусавыя. Страусы ў гаспадарцы Каптышаў з'явіліся некалькі гадоў таму, ну, і паўліны, фазаны. Ёсць індыкі. Па суседстве з апошнімі пасяліліся буслы. Іх нярэдка прыносяць жыхары гэтай ці суседніх вёсак, калі знаходзяць параненую альбо хворую птушку, што засталася зімаваць. А тут усіх прымаюць. Нібы таго голуба, што дзеці знайшлі напаўжывым. Ён не толькі паправіўся, але і стаў адчуваць сябе самым галоўным. Наталля кажа, што зусім дарэмна голуба называюць птушкай міру, іхні сваёй ваяўнічасцю абвяргае ходкі міф, бо лічыць за норму стасункаў пабіцца з усімі. І добра, што крылы ратуюць, калі ён надакучвае іншым насельнікам заалагічнага падворка. Вашага карэспандэнта шызы птах крыху патузаў за валасы, але нямоцна. І гэта таксама адна з мілых асаблівасцей заасада, які стварылі двое апантаных. Яны вельмі любяць братоў нашых меншых. Апошняе лёгка чытаецца па дагледжаным, задаволеным выглядзе многіх і многіх прадстаўнікоў фауны, асобныя з якіх пры з'яўленні гаспадароў адразу просяцца на рукі.

## Замест кватэры — аграсядзіба

Зразумела, каб заапарк стаў такім, як ёсць цяпер, спатрэбілася каласальная праца. Спачатку сужэнцы прывялі ў парадак участак, адрамантавалі, добраўпарадкавалі дом, падвялі камунікацыі. Пабудавалі вальеры і памяшканні для жывёлы. Тым часам прадалі кватэру ў горадзе і ўзвялі побач з жылым гасцявы домік. Цяпер у іх яшчэ зарэгістраваная аграсядзіба. Гаспадары могуць прымаць турыстаў. Праўда, за мінулае лета гэтым давялося займацца толькі два разы. Дзесяць дзён гасцявала бабуля з унучкай з Мінска, і дзве сямейныя пары знялі пакоі, каб адзначыць юбілей аднаго з наведвальнікаў. Але Наталля Генадзеўна ў гэтым сэнсе вялікі аптыміст: яна спадзяецца, што, нягледзячы на тое, што турызм у Беларусі толькі набірае абароты, ён будзе развівацца, і іх сядзіба яшчэ стане папулярнай у тых, хто шукае стасункаў з жывой прыродай. Таму і старэйшую дачку адправілі вучыцца ў Польшчу, дзе яна атрымае падрыхтоўку па асновах турыстычнага бізнесу.

А малодшая, першакласніца Дамініка, вельмі любіць жывёл і птушак, яна ўжо, лічы, вырасла ў стасунках з імі. Старэйшая Алівія таксама ва ўсім дапамагае бацькам, калі бывае дома. У Каптышаў няма праблем, як у іншых: як адвадзіць дзяцей ад камп'ютара. Дзяўчынкі ўвесь час на вуліцы: яны і гаспадаркай займаюцца, і экскурсіі дапамагаюць праводзіць. «І я вельмі рада, — гаворыць мама Наталля. — А то некаторыя гарадскія дзеці не могуць адрозніць казу ад авечкі, карову ніколі не бачылі блізка». Гэта яна зразумела, калі сталі арганізоўваць экскурсіі.

## Вярблюд на дажынках і ліса з біяграфіяй

Расказваць гасцям пра сваіх гадаванцаў яны ўмеюць. Любімцы гаспадара — перуанскія бязгорбыя вярблюды — альпакі. Яны ўдвая меншыя за звычайных вярблюдаў, у іх вельмі каштоўная шэрсць. Стрыгуць жывёлін раз на два гады. І сёлета з кожнай асобіны атрымалі па восем кілаграмаў каштоўнай сыравіны. Можна вязаць цёплыя шкарпэткі ды рукавіцы. Цікава, што самец альпакі карычневага колеру, а самачка белая. Яна старэйшая і больш баязлівая. А яе сябар малады і рахманы, бо вырас каля людзей. Сёлета яго вазілі на раённыя дажынкі. У легкавую машыну на задняе сядзенне вярблюда ўдалося ўладкаваць вельмі лёгка, такім жа чынам яго транспартавалі і дадому. І хоць радзіма гэтых звяроў — Лацінская Амерыка, да нашых зім яны адаптаваліся добра. Іх гаспадары заапарка купілі ў Польшчы.

У кожнага насельніка тут свая гісторыя і біяграфія. Многія прыехалі на ПМЖ з мінскага заапарка, куды траплялі таксама па-рознаму. Мілы янот, які любіць лазіць па клетцы, нібы хамяк, жыў у адной мінскай кватэры. Але неўзабаве надакучыў сваёй гаспадыні, і яна прынесла яго ў заапарк. Там новага кватаранта пасялілі па суседстве з ваўком. Шэры злаўчыўся ды адкусіў небараку пальцы на лапе. Неўзабаве раны зажылі, у Дзколах яму падабралі сяброўку, у гэтай пары ўжо ёсць папаўненне.

Ліса непрывычнай белай афарбоўкі жыла наогул у рэстаране, таксама ў Мінску. Ну і, вядома, ела не толькі са сваёй міскі, магла пачаставацца і з талерак наведвальнікаў. Адным гэта падабалася, а іншым... Таму лісіца цяпер у вясковым заапарку. І сварыцца са сваёй чарнабурай сяброўкай гукамі, падобнымі да кацінага мяўкання. А іх рыжы кавалер пры гэтым стрымана маўчыць. «За лісамі асаблівы догляд патрэбны, — расказвае Наталля, — вальеры даводзіцца мыць з хлоркай кожны дзень, каб нейтралізаваць характэрны пах».

А мілы прыгажунчык сурыкат, як і любая добрая істота, вечна церпіць за сваю дабрыню. Ён лезе да іншых насельнікаў з намерам сябраваць, а яго нярэдка б'юць. Аднойчы нехта ваяўнічы так ударыў, што ледзьве адкачалі небараку, таму сурыкатаў цяпер шчыльна закрываюць у клетцы... Гаспадары могуць гадзінамі расказваць пра сваіх гадаванцаў.

## Не лазня, а воўчая вальера

У ліку апошніх насельнікаў заасаду ў Дзколах — пара ваўкоў. Сабралі Каптышы грошы на лазню, а тут ваўчаняты падвярнуліся амаль задарам. Вось толькі вальера для іх, пабудаваная па ўсіх правілах бяспекі, якраз у кошт добрай лазні абышлася. Для ваўкоў трэба рабіць загараду з фундаментам, заглыбленым амаль на метр у зямлю, ну і шмат іншых нюансаў маецца. Камісія прыязджае, вальеру аглядае, толькі тады жывёлін рэгіструюць. Ваўчаняты пакуль яшчэ шчанюкі, выглядаюць даволі забаўна, увесь час гуляюць, коўзаюцца, але норы рыюць.



Юрый КАПТЫШ з сурыкатам.

Экскурсій у Каптышаў найбольш летам. Бываюць наведвальнікі і зімой, калі дзяцей прывозяць арганізаванымі групамі. Для інвалідаў, выхаванцаў дзіцячых дамоў, прыёмных сем'яў экскурсіі ладзяцца бясплатна. Дзеці бываюць шчаслівымі, калі ім дазваляюць блізка падысці да жывёлін, а некаторых пагладзіць і ўзяць на рукі. Ды і дарослыя часта становяцца падобнымі да дзяцей, шчыра ўсміхаюцца, радуюцца, становяцца такімі непасрэднымі. «Мы навучыліся атрымліваць добрую станоўчую энергію ад жывой прыроды і гатовыя дзяліцца ёю з іншымі», — гаворыць Наталля.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

*Баранавіцкі раён.*

# ЖУРАВІНЫ НА ЖАДАХ



Уладзіслаў СІДАРЭНКА працуе электразваршчыкам у Наваполацку і ў разгар журавінавага сезона бярэ адпачынак.

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Балота Жады, якое знаходзіцца ў Мёрскім раёне, — не самае вялікае па плошчы, але адна з самых ураджайных на журавіны мясцін. Таму сюды накіроўваюцца і тутэйшыя жыхары, і прыезджыя. Сёлета мне ўпершыню давялося пабываць на Жадах і паназіраць, як людзі збіраюць і нясуць сабраны ўраджай ягад, які гэтым разам надзвычай багаты, па балотных калянах — на Віцебшчыне пралілося нямала дажджоў. Давялося паразмаўляць з самімі ўдзельнікамі нарыхтоўчай кампаніі.

Пенсіянер з вёскі Язна Уладзімір Коласаў ужо пяты раз гэтай восенню наведвае Жады, наогул, гадоў дваццаць ён збірае журавіны. Ад вёскі да балота сама мала дзесяць кіламетраў, але да некранутых ягадных плантацый трэба ісці па балоце па пяць-шэсць кіламетраў — гэта амаль дзве гадзіны хадзьбы.

— Выязджаю з дому а шостай гадзіне раніцы, а пачынаю збіраць журавіны толькі ў дзевяць, — кажа Уладзімір Савельевіч. — За дзень збіраю па пяць дзесяцілітровых вёдраў.



**Легенда Жадаў і рэкардсменка па зборы ягад сярод ягадніц вёскі Язна — Вольга ІЗАІТКА.**

Другі язнянец, таксама пенсіянер Леанід Шчарбіцкі, ужо 18-ы раз у гэтым сезоне на балоце і кожны раз напаўняе журавінамі поўны бульбяны мех, у які змяшчаецца не меней за 30 кіло. Уявіце, Леаніду Канстанцінавічу праз два гады будзе восемдзесят.

— Журавіны — добрая дабаўка да нашых пенсій, — кажа Леанід Шчарбіцкі. — Як-ніяк, а за дзень на журавінах можна зарабіць па семдзесят і болей рублёў.

Пенсіянер лёгка ўскідвае важкі мех на плечы і нетаропка кіруе па натаптанай сцежцы, напоўненай рудою вадой. А побач з ім дабірае свой мех пенсіянер Фёдар Кухта, які прыехаў ажно з Глыбокага.

Цікава, што на балоце ў гэты час можна сустрэць і шмат маладых людзей. Уладзіслаў Сідарэнка працуе электразваршчыкам у Наваполацку і ў разгар журавінавага сезона бярэ адпачынак. У гэтым сезоне на Жадах ён дзясяты раз. Усміхаецца, задаволены — і добрымі журавінамі, і добрым надвор'ем. Калі няма дажджу, гэта ўжо добрае надвор'е.

— Адпачынак на балоце — лепшага не прыдумаеш, — гаворыць Уладзіслаў і працягвае: выдатнае паветра, цішыня, добрыя думкі ў галаве. Вядома, нялёгка збіраць ягады, але лішняя капейка не бракуе. Мае калегі з працоўнага калектыву замовілі мне, каб і для іх я назбіраў — бо журавіны на Жадах і Ельні — самыя экалагічна чыстыя ягады. Разам з Уладзіславам шчыруе яго сусед і аднакласнік Арцём Пучкоўскі.

Легенда Жадаў і рэкардсмен па зборы ягад сярод вясковых ягадніц вёскі Язна — Вольга Ізаітка. У любое надвор'е яна на балоце. Гэтым разам жанчына таксама збірала журавіны, і я падгледзеў у мяшку Вольгі буйныя, спелыя і чыстыя ягады — на зайздрасць іншым збіральнікам. Сабраць трыццаць кілаграмаў за палову дня для такой прафесіяналкі як яна — лёгка. У другой гадзіне папаўдні Вольга ўжо збіраецца дадому. Наперадзе шэсць кіламетраў па багне, перадолець якія ёй дапамагаюць боты-балотнікі.

Учора, перад тым, як паставіць кропку ў гэтым фотарэпартажы, я дазваніўся ў вёску Язна нарыхтоўшчыку журавін і даведаўся пра кошт — за здадзены кілаграм даюць па 2 рублі 90 капеек, а гэта значыць, што за дзень можна зарабіць амаль 90 рублёў.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*Шчырая ўдзячнасць за дапамогу ў падрыхтоўцы гэтага фотарэпартажу жыхару вёскі Бясянкі З Аляксандру Якушыну, які на сваім балотаходзе даставіў мяне ў самае сэрца Жадаў.*

**Больш здымкаў з гэтага фотарэпартажу глядзіце на сайце zviazda.by**



Пенсіянер з вёскі Язна Уладзімір КОЛАСАЎ збірае журавіны гадоў дваццаць.

■ Еўрагульні. Чакаем разам!

# ЛЕГЕНДАРНЫ ПАЛАЦ ДЛЯ НОВЫХ ЗДЗЯЙСНЕННЯЎ

## Спарткомплекс «Уручча» і стралковы цір імя Цімашэнкі гатовыя прыняць спаборніцтвы II Еўрапейскіх гульняў


Будаўніцтва новага корпуса ціра.

**Палац лёгкай атлетыкі на ўскраіне Мінска пасля рэканструкцыі адкрыўся ў пачатку 2016 года. Сама па сабе пляцоўка мае ўнікальную гісторыю, у яе сценах пад кіраўніцтвам вядомага гандбольнага трэнера Спартака Мірановіча выраслі восем алімпійскіх чэмпіёнаў. Легендарны мінскі СКА здабываў там цяжкія, але яркія перамогі на самых прэстыжных еўрапейскіх турнірах. Сёння са старэнькага лёгкаатлетычнага манежа Палац спорту «Уручча»ператварыўся ў сучаснае спартыўнае збудаванне.**


Так выглядае галоўная арэна спарткомплекса «Уручча».

Пляцоўка стала ўніверсальнай, пры рэканструкцыі акцэнты зрушылі на гульнявыя віды спорту, цяпер тут можна праводзіць трэніроўкі і гульні па гандболе, валейболе, баскетболе, міні-футболе і нават бадмінтоне. На месцы лёгкаатлетычных дарожак з'явіліся трыбуны, разлічаныя на 3000 месцаў.

*— Палац зроблены вельмі якасна і адпавядае ўсім міжнародным патрабаванням. На сённяшні момант у ім ужо праведзены шэраг буйных спаборніцтваў сусветнага маштабу, водгукі мы атрымалі самыя станоўчыя,* — расказвае **першы намеснік старшыні Спартыўнага камітэта Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь Кірыл ЧУПРЫС.** *— Палац укамплектаваны выдатнай трэнажорнай залай, ёсць аднаўленчы цэнтр, аддзел спартыўнай медыцыны, які аснашчаны самым перадавым абсталяваннем.*

Аб'ект уключае ў сябе тры асноўныя пляцоўкі: галоўная арэна і яшчэ дзве трэніровачныя залы, адна з якіх мае камфортную трыбуну для 300 гледачоў. Усе пляцоўкі абсталяваны ў адпаведнасці з патрабаваннямі безбар'ернага асяроддзя, якое дазваляе людзям з абмежаванымі магчымасцямі карыстацца паслугамі комплексу незалежна ад чыёй-небудзь дапамогі і актыўна ўдзельнічаць у спартыўных мерапрыемствах.

Па якіх відах спорту прыме спаборніцтвы палац ва Уруччы ў 2019 годзе яшчэ невядома, але Кірыл Леанідавіч адзначае, што яны гатовыя стварыць камфортныя ўмовы для прадстаўнікоў бокса, бадмінтона, барацьбы, дзюдо і спартсменаў іншых відаў. У палаца ўжо ёсць пэўны вопыт правядзення міжнародных спаборніцтваў. Напрыклад, якраз цяпер там праходзяць гульні мініфутбольнай Лігі чэмпіёнаў, а праз тыдзень спарткомплекс «Уручча» прыме ўжо матч гандбольнага Кубка ЕГФ.

Калі Палац спорту ўжо гатовы, то стралковы комплекс імя Цімашэнкі толькі збіраецца адчыніць свае дзверы для аматараў спорту. Ён быў пабудаваны ў 1971 годзе і названы імем вялікага чалавека — Маршала Савецкага Саюза Сямёна Канстанцінавіча Цімашэнкі, двойчы Героя Савецкага Саюза. У сценах комплексу вырасла вялізная колькасць беларускіх стралкоў.

*— У армейскага спорту багатыя традыцыі, на ўсіх буйных стралковых спаборніцтвах (Алімпійскіх гульнях, чэмпіянатах свету і Еўропы) прадстаўлены нашы спартсмены — Ігар Басінскі і Сяргей Мартынаў — прызёры Алімпіяд і сусветных першынстваў. Цяпер з'явілася новая плеяда маладых армейскіх стралкоў — гэта Віталь Бубновіч і Юрый Шчарбацэвіч, якія рэгулярна прывозяць медалі з міжнародных спаборніцтваў,* — расказвае Кірыл Чупрыс.

Зараз стралковы комплекс на рэканструкцыі, работы на аб'екце пачаліся сёлета ў лютым. Плануецца пабудаваць новы корпус, дзе размесцяцца чатыры ціры: тры закрытага тыпу, адзін — напаўадкрытага. Прадугледжаны памяшканні для спартсменаў, трэнерскага складу і адміністрацыйнага персаналу. Асобныя пляцоўкі абсталююць для стральбы з лука і пейнтбола.

*— Штуршком для рэканструкцыі паслужыла правядзенне ў Беларусі II Еўрапейскіх гульняў. Больш маштабных стралковых аб'ектаў у нас у краіне няма. Ва Уруччы можна праводзіць адначасова спаборніцтвы ў адкрытых і ў закрытых памяшканнях,* — адзначае першы намеснік старшыні Спартыўнага камітэта Узброеных Сіл.

Першапачаткова планавалася, што аб'ект будзе ўведзены ў эксплуатацыю ў лістападзе наступнага года, але тэрміны перагледзелі і перанеслі на верасень 2018-га. Гэта робіцца для таго, каб у абноўленым стралковым комплексе яшчэ да Еўрапейскіх гульняў правесці буйны турнір і, так сказаць, абкатаць аб'ект.

Для гледачоў, якія прыйдуць паназіраць за спаборніцтвамі па стральбе, прадугледжаны камфортнае размяшчэнне на трыбунах (у тым ліку для людзей з абмежаванымі магчымасцямі будуць зроблены ліфты і пандусы) і зручная паркоўка. З дапамогай сучаснага абсталявання інфармацыя з мішэняў будзе выводзіцца на вялікія маніторы, каб балельшчыкі маглі адсочваць вынікі ў рэжыме анлайн.

Кірыл Леанідавіч адзначае, што аб'ект будуецца не толькі для Еўрагульняў, і да і пасля іх ён будзе актыўна выкарыстоўвацца.

*— Сродкі, якія ўкладваюцца ў рэканструкцыю, інвеступоцца ў развіццё кулявой стральбы і спартыўна-масавага руху. 50-метровы цір ужо ўведзены ў эксплуатацыю, там праводзяцца вучэбна-трэніровачныя зборы нацыянальнай каманды, трэніруюцца таксама стралкі, якія прадстаўляюць краіну на спаборніцтвах па ваенным і сучасным пяцібор'і.*

У далейшым у стралковым комплексе імя Цімашэнкі будуць праводзіцца не толькі зборы, але і спаборніцтвы рэспубліканскага і еўрапейскага маштабу. Гэтак жа ён падыходзіць для правядзення чэмпіянату свету па кулявой стральбе сярод вайскоўцаў. На базе комплексу будзе створана спартыўная дзіцяча-юнацкая школа, якая стане добрай дапамогай для нацыянальнай каманды.

Карыстацца паслугамі ціра і Палаца спорту «Уручча» могуць і звычайныя мінчане, спецыяльна для гэтага ў стралковым комплексе будзе створана пляцоўка для гульні ў пейнтбол, а ў палацы ўжо функцыянуюць заняткі па фітнесе, саўны і аматарскія ўрокі гульні ў бадмінтон ■


Дырэктар ціра Алег Грыгарэнка дэманструе новае абсталяванне.

Фота Надзеі БУЖАН.

■ Экспрэс-навіны

# АПОШНЯЯ БІТВА

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра дамашні матч нашых футбалістаў у адборы на чэмпіянат свету і сённяшнюю гульню ў Парыжы. А таксама падводзім вынікі выступлення гандбольных прадстаўнікоў краіны на турнірах у Еўропе.**

**1.** ***У заключным туры адборачнага турніру чэмпіянату свету — 2018 сёння зборная Беларусі згуляе ў Парыжы з французамі.*** Балгары выступяць у гасцях у Люксембурга, галандцы прымуць на сваім полі шведаў.

Нагадаем, наша футбольная зборная ў суботу прайграла камандзе Нідэрландаў — 1:3. Адзначым, што з розных прычын у матчы з галандцамі не змаглі прыняць удзел Павел Савіцкі і Міхаіл Гардзяйчук.



Адзіным голам у беларусаў на 55-й хвіліне адзначыўся Максім Валадзько. У галандцаў вызначыліся Дэві Прэпер, Ар'ен Рабэн і Мэмфіс Дэпай.

*— Трохі скаваны атрымаўся першы тайм, сапернік валодаў мячом, даводзілася абараняцца. А вось другі тайм атрымаўся нядрэнны. Шмат вастрыні, шмат падыходаў да штрафной. Шкада, што дастаткова спрэчнае рашэнне суддзі прывяло да паражэння,* — адзначыў пасля матча **галоўны трэнер зборнай Ігар КРЫВУШЭНКА.** *— Хлопцы адчуваюць, што яны гулялі ў гэтым матчы. Прымусілі саперніка абараняцца, нерваваца. Гэта павінна надаць упэўненасці ў матчы з французамі.*

*— Усё ж такі мы не дамагліся станоўчага выніку. Мэтай было як мінімум не саступіць. Тым больш гулялі дома. Так, нам супрацьстаяў гранд, аднак мы выходзілі на поле з залімітавым настроем і ставілі сабе канкрэтную мэту: узяць ачкі,* — пракаментаваў сустрэчу **абаронца беларусаў Сяргей ПАЛІЦЭВІЧ.**

У іншых суботніх сустрэчах кваліфікацыйнай групы А зборная Францыі ў Сафіі адолела Балгарыю 1:0, а ў Стакгольме шведы разграмілі футбалістаў Люксембурга — 8:0.

Турнірнае становішча пасля 9 тураў: Францыя — 20 ачкоў (розніца мячоў — 16—5), Швецыя — 19 (26—7), Нідэрланды — 16 (19—12), Балгарыя — 12 (13—18), Беларусь — 5 (5—19), Люксембург — 5 (7—25).

**2.** ***Дзюдаіст Дзмітрый Мінькоў заваяваў залаты медаль на этапе Гран-пры ў Ташкенце з прызавым фондам $100 тыс.*** У першай сутычцы Дзмітрый (вагавая катэгорыя — 66 кг) атрымаў перамогу чыстым кідком над спартсменам з Казахстана, а наступны паядынак эфектна выйграў у прадстаўніка Бельгіі. У спаборніцтве за выхад у фінал беларус аказаўся мацнейшы за ўзбекскага дзюдаіста. У сутычцы за залатую ўзнагароду Дзмітрый МІНЬКОЎ адолеў атлета з Манголіі. Другую ўзнагароду ў скарбонку прынёс Ягор ВАРАПАЕЎ. Ён стаў бронзавым прызёрам.

За 14 камплектаў узнагарод змагаліся больш за 200 спартсменаў з 29 краін.

**3.** ***Мінскі «Будаўнік» заваяваў Суперкубак Беларусі па валейболе сярод мужчынскіх каманд, абыграўшы на сваёй пляцоўцы чэмпіёна краіны салігорскі «Шахцёр» — 3:1 (25:15, 25:23, 23:25, 25:18).***

Адзначым, што салігорскі клуб чакае дэбют у кваліфікацыі Лігі чэмпіёнаў. 18 кастрычніка каманда на выездзе згуляе з «Макабі» з Тэль-Авіва, паядынак у адказ адбудзецца 22 кастрычніка на пляцоўцы Палаца спорту «Уручча». Мінскі «Будаўнік» у снежні стартуе ў Кубку выкліку ЕКВ, у якім дамогся самага значнага поспеху для беларускіх клубаў і дайшоў да паўфіналу турніру ў 2015 годзе.

**4.** ***Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова ў чацвёртым туры Лігі чэмпіёнаў на выездзе перамог дацкі «Ольбарг».*** Першую палову сустрэчы за сабой пакінулі гаспадары пляцоўкі — 11:10, аднак «мяшкоўцы» да 40-й хвіліны матча ўжо вялі з розніцай у чатыры мячы. Вынік сустрэчы — 23:20 на карысць беларускага клуба.

14 кастрычніка на выездзе брастаўчане будуць супрацьстаяць «Цэле».

**5.** ***Гандбалісты мінскага СКА паспяхова правялі першы матч 2-га кваліфікацыйнага раўнда розыгрышу Кубка ЕГФ супраць «Бухарэста».*** Віцэ-чэмпіёны Беларусі завяршылі першую палову гульні ўнічыю з роўным лікам 14:14, а пасля перапынку згулялі яшчэ мацней, дабіўшыся перамогі з лікам 30:26.

Зваротны паядынак за выхад у 3-і адборачны круг падапечныя Ігара Папругі правядуць 15 кастрычніка на пляцоўцы мінскага Палаца спорту «Уручча».

**6.** ***Беларускі спецыяліст Эдуард Занкавец прызначаны галоўным трэнерам браціслаўскага «Слована».*** 48-гадовы настаўнік змяніў у славацкай камандзе 58-гадовага чэха Мілаша Ржыгу, які трэніраваў «Слован» з 2015 года. Раней Эдуард Занкавец узначальваў «Барыс» з Астаны і зборную Казахстана. У 2010—2011 гадах ён быў галоўным трэнерам нацыянальнай зборнай Беларусі ■



Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. lobazhevich@zviazda.by

**ЗАВЕРЕНО**
Департаментом по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
05.10.2017 г.
Лихачевский В. В.

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## ОБ ЭМИССИИ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ двадцатого выпуска Общества с ограниченной ответственностью «ТАПАС»

1. Полное и сокращенное наименование эмитента:

на белорусском языке: полное – Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ТАПАС»; сокращенное – ТАА «ТАПАС»;

на русском языке: полное – Общество с ограниченной ответственностью «ТАПАС» (далее – эмитент); сокращенное – ООО «ТАПАС».

2. Местонахождение эмитента: Республика Беларусь, 220049, г. Минск, ул. Кнорина, д. 17, 4-й этаж, офис 14, тел/факс: 8 (017) 3028410, сайт: www.taps.by (далее – сайт эмитента).

3. Эмитент зарегистрирован Минским городским исполнительным комитетом 27 июля 2001 г. Регистрационный номер 101484246.

4. Уставный фонд эмитента составляет 342 400,10 белорусских рублей.

5. Основной вид деятельности эмитента: реализация проектов, связанных со строительством зданий.

6. Депозитарием эмитента является депозитарий открытого акционерного общества «БПС-Сбербанк» (зарегистрирован в Национальном банке Республики Беларусь 28 декабря 1991 г., регистрационный №25; действует на основании специального разрешения (лицензии) Министерства финансов Республики Беларусь на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам №02200/5200-1246-1086, выданного 8 декабря 1993 г., срок действия не ограничен; местонахождение: 220005, Республика Беларусь, г. Минск, бульвар имени Мулявина, 6).

7. Эмитент в соответствии с законодательством Республики Беларусь раскрывает информацию на рынке ценных бумаг путем:

размещения на едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг (далее – Единый информационный ресурс);

публикации в печатных средствах массовой информации (в газете «Звязда» и (или) доводит до сведения неопределенного круга лиц иным образом, определенным республиканским органом государственного управления, осуществляющим государственное регулирование рынка ценных бумаг (далее – Регистрирующий орган).

Информация об изменениях и/или дополнениях, внесенных в Проспект эмиссии жилищных облигаций двадцатого выпуска эмитента (далее – Проспект эмиссии), размещается эмитентом на Едином информационном ресурсе, а также публикуется в газете «Звязда» не позднее 7 дней после их регистрации в Регистрирующем органе.

Эмитент в соответствии с законодательством Республики Беларусь раскрывает годовой отчет (бухгалтерскую отчетность) в срок не позднее одного месяца после его утверждения в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь о хозяйственных обществах, путем:

размещения на Едином информационном ресурсе;

опубликования в газете «Звязда» либо размещения на сайте эмитента.

Эмитент раскрывает информацию о своей реорганизации или ликвидации, а также о реорганизации дочерних и зависимых хозяйственных обществ эмитента (при их наличии), в соответствии с законодательством Республики Беларусь, в том числе путем ее размещения на Едином информационном ресурсе не позднее двух рабочих дней:

в случае ликвидации – с даты принятия соответствующего решения Общим собранием участников эмитента;

в случае реорганизации – с даты принятия соответствующего решения Общим собранием участников эмитента, а также с даты государственной регистрации организации, созданной в результате реорганизации; даты внесения в Единый государственный регистр юридических лиц и индивидуальных предпринимателей записи о прекращении деятельности присоединенной организации.

Кроме того, в случае принятия эмитентом решения о ликвидации (прекращении деятельности), сведения о том, что эмитент находится в процессе ликвидации (прекращения деятельности), подлежат размещению в глобальной компьютерной сети Интернет на официальном сайте юридического научно-практического журнала «Юстиция Беларуси» (www.justbel.info) в порядке и сроки, определенные законодательством Республики Беларусь.

Эмитент раскрывает информацию о возбуждении в отношении эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) в соответствии с законодательством Республики Беларусь путем:

ее размещения на Едином информационном ресурсе не позднее двух рабочих дней с даты получения эмитентом копии заявления в экономический суд о банкротстве эмитента;

публикации в журнале «Судебный вестник Плюс: Экономическое правосудие» в течение 5 календарных дней с момента получения соответствующего судебного постановления.

Эмитент раскрывает информацию о результатах финансово-хозяйственной деятельности, информацию о существенных фактах (событиях, действиях), касающихся его финансово-хозяйственной деятельности, которые могут повлиять на стоимость жилищных облигаций настоящего выпуска, в порядке и сроки, установленные законодательством Республики Беларусь.

8. Общее собрание участников эмитента приняло решение о двадцатом выпуске жилищных облигаций 30 августа 2017 г., протокол №6/н.

9. Эмитент является заказчиком (застройщиком) объекта строительства: «Многофункциональный комплекс в границах пр-т Победителей–улиц Ратомской (Браславской)–Тимирязева в г. Минске». 1-ая очередь строительства. (далее – Объект строительства).

Государственная экспертиза проектной документации проведена Республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза»: Заключение государственной экспертизы (положительное) от 4 января 2016 г. №1127-15/15 (в дополнение к заключению государственной экспертизы от 28 декабря 2015 г. №1131-15/15).

Объект строительства входит в состав многофункционального комплекса «Многофункциональный комплекс в границах пр-т Победителей–улиц Ратомской (Браславской)–Тимирязева в г. Минске», в котором предусмотрено 11 очередей строительства.

Объектом жилищного строительства по настоящему выпуску облигаций является 1-я очередь строительства – жилой многоквартирный дом №7 по г. п. (далее – жилой дом).

Права эмитента на земельный участок, необходимый для обеспечения строительства жилого дома, подтверждены:

свидетельством (удостоверением) №500/1312-5901 от 3 марта 2016 г. о государственной регистрации в отношении земельного участка с кадастровым номером 500000000007007249.

Нормативная продолжительность строительства – 20,5 месяца, в том числе подготовительный период – 1 месяц.

Предполагаемая дата приемки в эксплуатацию жилого дома – 4-й квартал 2017 г.

10. Облигации двадцатого выпуска – жилищные, именные, конвертируемые эмиссионные ценные бумаги в бездокументарной форме, имеющие равную номинальную стоимость и сроки осуществления прав в рамках настоящего выпуска вне зависимости от времени приобретения облигации (далее – облигации).

Объем выпуска облигаций – 990000 белорусских рублей.

Количество облигаций – 1500 штук.

Облигация имеет номинальную стоимость 660 белорусских рублей и эквивалент этой стоимости, выраженный в квадратных метрах общей площади жилого помещения в жилом доме, равный 1 квадратному метру. Указанный эквивалент номинальной стоимости остается неизменным.

Доход по облигациям не начисляется и не выплачивается.

11. Выпуск облигаций зарегистрирован Регистрирующим органом 05.10 2017 г. Государственный регистрационный номер: 5-200-02-3116.

12. Эмитент осуществляет эмиссию необеспеченных облигаций без учета положений, предусмотренных в подпункте 1.7 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 г. №277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг», в соответствии с подпунктом 1.8 пункта 1 названного Указа.

13. Размещение облигаций эмитентом осуществляется на неорганизованном рынке путем открытой продажи юридическим и (или) физическим лицам – резидентам и (или) нерезидентам Республики Беларусь (далее – покупатели облигаций).

Дата начала размещения облигаций: 25 сентября 2017 г.

Дата окончания размещения облигаций: 30 марта 2018 г., если иная дата не будет определена Общим собранием участников эмитента в порядке и в сроки, установленные законодательством Республики Беларусь о ценных бумагах.

Отношения сторон оформляются:

договором с эмитентом, предусматривающим обязательства эмитента по строительству жилых помещений в жилом доме владельцу облигаций, а также иные существенные условия в соответствии с законодательством Республики Беларусь;

договором купли-продажи облигаций, который имеют право заключать покупатели облигаций, заключившие договор с эмитентом.

Для заключения договора с эмитентом и договора купли-продажи облигаций покупатели могут обратиться к эмитенту:

по адресу: г. Минск, ул. Кнорина, 17, 4-й этаж, офис 14;

ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Открытая продажа облигаций осуществляется по договорной цене, определяемой эмитентом в зависимости от ситуации на рынке строительства и недвижимости на момент продажи облигаций, а также исходя из соотношения спроса и предложения на рынке ценных бумаг.

Средства при проведении открытой продажи уплачиваются в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь, в безналичной форме, в белорусских рублях, на расчетный счет эмитента №BY34-BLBB30120101484246001002 в Открытом акционерном обществе «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29, БИК BLBBBY2X.

14. Срок обращения облигаций – 217 календарных дней (с 25 сентября 2017 г. по 30 апреля 2018 г.)

15. Дата начала погашения облигаций – 30 апреля 2018 г.

Для целей погашения облигаций депозитарий эмитента формирует реестр владельцев облигаций на 23 апреля 2018 г. В случае если дата формирования реестра выпадает на нерабочий день, формирование реестра осуществляется в последний рабочий день, предшествующий нерабочему дню.

Владелец облигаций при погашении (досрочном погашении) облигаций имеет право получить номинальную стоимость облигации, либо жилое помещение в жилом доме, общая площадь которого соответствует эквиваленту номинальной стоимости, выраженному в квадратных метрах, принадлежащих ему облигаций.

16. В случае запрещения эмиссии облигаций, признания Регистрирующим органом двадцатого выпуска жилищных облигаций недействительным, эмитент возвращает владельцам облигаций средства, полученные в оплату размещенных облигаций в месячный срок с даты признания выпуска недействительным и письменно уведомляет Регистрирующий орган о возврате указанных средств владельцам облигаций в полном объеме.

17. Ознакомиться с Проспектом эмиссии (изменениями в Проспект эмиссии – при наличии) можно в пункте продажи облигаций, указанном в пункте 13 настоящего документа.

Директор Общества с ограниченной ответственностью «ТАПАС» — С. П. Ставер

Главный бухгалтер Общества с ограниченной ответственностью «ТАПАС» — И. А. Голубь

## Извещение об открытом аукционе по продаже земельных участков в собственность в г. Гродно (микрорайоны «Заболоть», «Барановичи-5,6», ул. Кульбакская, ул. Весенняя) 14 ноября 2017 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Ориентировочная стоимость затрат на изготовление документации, руб. | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Земельный участок У-226 * | микрорайон «Заболоть» | 0,1127 | 440100000003005263 | – | 14 841,76 | 2 700 |
| 2. | Земельный участок У-150 * | микрорайон «Барановичи-5,6» | 0,0990 | 440100000003004996 | – | 11 817,12 | 2 300 |
| 3. | Земельный участок У-1* | ул. Кульбакская в районе жилого дома №35 | 0,1084 | 440100000001010125 | 3 400,0 | 23 398,31 | 4 700 |
| 4. | Земельный участок У-1*,** | ул. Весенняя между домовладениями №25 и №27 | 0,0621 | 440100000002009240 | 3 400,0 | 31 710,64 | 6 200 |

*Инженерные коммуникации на участке отсутствуют.
**Земельный участок имеет обременения.

Змельные участки предоставляются в частную собственность для строительства одноквартирного жилого дома.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

обращение за государственной регистрации прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 08.02.2016 №49 «О некоторых вопросах возмещения затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

Аукцион состоится 14 ноября 2017 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 ( актовый зал).

Для участий в аукционе необходимо: внести задаток не позднее **8 ноября 2017 года** в размере, указанном в графе 8, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале №400 ГОУ ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594 получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению;

Представить в КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы;

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, каб. 57 с 9 октября по 8 ноября 2017 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный подавший заявление на участие в аукционе в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан;

внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся, решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактные телефоны: + 375 (152) 72 05 46, 72 05 37, официальный сайт организатора торгов www.grodno.gov.by

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Планар» проводит повторный открытый аукцион по продаже **здания цеха деревообработки**, общей площадью **1 307,1 кв. м**, инв. №601/С-27937, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623288005101000004 (предоставлен на праве постоянного пользования) площадью 0,3209 га, по адресу: Минская область, Логойский район, Янушковичский с/с, д. Жабичи, ул. Метростроевская, 20Г.

Здание цеха деревообработки сдается в аренду *(сведения можно получить у организатора аукциона или продавца)*.

Начальная цена с НДС (20%) – **337 841,66** бел. руб. **Стоимость снижена на 20%.** Задаток 10% от начальной цены (**33 784,00** бел. руб.), перечисляется на **р/с № BY55BPSB30121082600169330000, в ЦБУ №701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 13.07.2017. Аукцион состоится **25.10.2017** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.10.2017** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

Филиал «Гомельский областной центр по гидрометеорологии и мониторингу окружающей среды» объявляет запрос ценовых предложений на проведение текущего ремонта 150 метров ограждения (сетка-рабица, трубы металлические) метеостанции «Ждановичи», расположенной по адресу: Гомельская обл., г. Житковичи, ул. Техническая, 5. Предложения принимаются в течение 5 рабочих дней с момента опубликования по адресу: 246029 г. Гомель, ул. Карбышева, 10.

УНП 401164232

## Антикризисный управляющий Правовая компания «БелПрофКонсалт» объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества:

ООО «Изоляционные технологии строй» (Дата торгов: **20.10.2017**), Станкотехинвест (Дата торгов: **11.10.2017**), имущества ООО «Трейдмаркстар» (Дата торгов: **18.10.2017**), дебиторской задолженности ООО «Пивбелком» (Дата торгов: **19.10.2017**), дебиторской задолженности ООО «Профметаллтрейд» (Дата торгов: **16.10.2017**), имущества СООО «НТС» (Дата торгов: **17.10.2017**).

**Место проведения торгов**: г. Минск, пр-т Победителей, 127, пом. 312.

Подробная информация по всем торгам и лотам, стоимости и условиям размещена на интернет-сайте **http://bankrot.gov.by/**

УНП 191875692

■ Светлая памяць

# АМБАСАДАР БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ Ў КІТАІ

## На 91-м годзе жыцця памёр перакладчык беларускай літаратуры на кітайскую мову Гао Ман

У гісторыі беларуска-кітайскіх літаратурных адносін былі розныя часіны. Пачатак, вытокі летапісу мастацкіх повязяў — у «нашанiўскім» перыядзе, калі газета надрукавала ці то паданні, ці то легенды ў перакладзе будучага акадэміка і рускага кітаіста М. Аляксеева. Вось так здарылася, што пераклаў на беларускую... Пасля была цікавасць Уладзіміра Дубоўкі да кітайскага мастацкага свету ў 1920-я... У 1930-я гады наведаўся ў Мінск кітайскі рэвалюцыйны паэт Эмі Сяа. Інфармацыйны газетны след пра гэтую сустрэчу кітайскага творцы застаўся і на адной са «звяздоўскіх» палос даваеннага часу. Пра гэта трэба расказваць асобна і падрабязна. 1949 год. Перамога камуністычных сіл у Кітаі нарадзіла новую хвалю цікаўнасці. Перакладчыкамі кітайскай літаратуры, кітайскіх народных казак (зразумела, праз рускую мову) зрабіліся пісьменнікі самыя розныя — Васіль Вітка, Мікола Татур, Лідзія Арабей, Янка Брыль, Сяргей Міхальчук, ды шмат хто яшчэ. І беларусаў пачалі выдаваць у Кітаі таксама. З таго часу займеў сваё ўяўленне пра Беларусь і Мінск (наведаўся ён да нас у 1956 годзе) перакладчык і мастак Гао Ман.



Фота Мікалая ЛІТВІНАВА.

Прыйшоў і новы перыяд — у канцы 1990-х, на пачатку 2000-х... Цяпер ізноў выходзяць кнігі кітайскіх аўтараў па-беларуску. І перакладаюць ужо паэзію Мэн Хаажаня, Ван Гачжэня, Лі Цінчжаа, Вэнь Ідо, Сюй Чжымо з арыгінала альбо з дакладных падрадкоўнікаў, зробленых маладымі беларускімі кітаістамі...

Нараджэннем з 1926 года (першыя свае крокі зрабіў у Харбіне, рускай мове вучыўся ў белаэмігрантаў), Гао Ман па зразумелых прычынах найперш пачаў перакладаць рэчы, якія выяўлялі ідэалагічны кірунак савецкай літаратуры. Так у Кітаі з яго пераўвасаблення на кітайскую пачала ставіцца п'еса па рамане Мікалая Астроўскага «Як гартавалася сталь». Так Гао Ман пераклаў па палітычнай патрэбе славутую ўкоўскую пастанову «супраць Ахматавай і Зошчанкі», супраць ленінградскіх часопісаў і свабоднага мастацкага волевыяўлення. Пасля, праз дзесяцігоддзі, перакладчык асэнсаваў усю сутнасць тых партыйных указанняў. І з'ездзіў на магілу Ганны Ахматавай, намаляваў яе партрэт і бліскуча (так сведчаць кітайскія літаратуразнаўцы) пераклаў ахматаўскі «Рэквіем»...

З 1956 года ўзнікла цікавасць у кітайскага перакладчыка, мастака-каліграфа і да Беларусі. Ён пазнаёміўся з Максімам Танкам. Наведаў майстэрню Заіра Азгура. У сваёй пекінскай кватэры (зусім нядаўна — у маі 2015 года) Гао Ман успамінаў мне словы беларускага скульптара: «Хачу наведаць Кітай... Хачу пабываць у Кітаі...» Не паспеў. Іншымі сталі часы, іншымі зрабіліся палітычныя стасункі паміж Кітаем і Савецкім Саюзам.

У 1957 годзе Гао Ман і Максім Танк сустрэліся ўжо ў Кітаі. Перакладчык стасаваўся з беларускім паэтам шмат дзён у час яго паездкі па Кітаі. А ў 1958 годзе ў Пекіне выйшла кніга выбранай паэзіі Максіма Танка. Перакладчыкі — Гэ Баацюань і У Ланьхань (псеўданім Гао Мана).

Так, прыйшоў перыяд зацішша для беларуска-кітайскіх літаратурных стасункаў. Прыйшла ў Кітай «культурная рэвалюцыя». Гао Ман, як ужо маштабна заявіў пра сябе як перакладчык савецкай літаратуры, аказаўся «пад прыцэлам». На шчасце, выжыў. Узначаліў рэдакцыю аўтарытэтнага часопіса «Сусветная літаратура». Пераклаў на кітайскую мову кнігу беларускіх народных казак. Напісаў некалькі артыкулаў пра беларускую культуру. Сярод іх — і невялікае сімпатычнае эсэ пра Георгія Паплаўскага як пра кніжнага графіка. У 1990 годзе ў Пекіне пабачыла свет аповесць Святланы Алексіевіч «Цынкавыя хлопчыкі» ў перакладзе Гао Мана... Лістуючыся з перакладчыкам у апошнія гады яго жыцця, я быў падобраму ўражаны той бязмежнай радасцю, якую кітайскі сябра Беларусі выказаў у сувязі з прысуджэннем Святлане Алексіевіч Нобелеўскай прэміі ў галіне літаратуры.

У 1980—1990-я гады і пазней Гао Ман сустракаўся ў Пекіне з беларускімі пісьменнікамі, літаратуразнаўцамі і журналістамі: Анатолем Вярцінскім, Рыгорам Барадуліным, Навумам Гальпяровічам, Інэсай Плескачэўскай, Вольгай Гальпяровіч, Аляксеем Чаротам, Марынай Каліцкай, Дар'яй Нечыпарук, Міколам Літвінавым... Для ўсіх ён знаходзіў час, нягледзячы на ўзрост і на развіццё цяжкай хваробы, якая і прывяла 6 кастрычніка 2017 года да развітання з зямным жыццём. Перакладчык расказваў не толькі пра сябе, больш расказваў пра ўласныя ўяўленні аб беларускай і савецкай літаратуры. Так, магчыма, у нечым ён застаўся чалавекам ранейшага часу. Яму цяжка было падзяліць савецкую літаратуру на нацыянальныя прасторы. Ён аднолькава моцна любіў Пушкіна і Шаўчэнку, якіх перакладаў у розныя гады. Ён з хваляваннем расказваў пра сваю работу над партрэтамі Васіля Быкава, Максіма Танка, Алеся Адамовіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Святланы Алексіевіч, Навума Гальпяровіча... І ўжо незадоўга перад смерцю ён выступіў у адной з самых тыражных газет Кітая з расповедам пра ўласныя беларускія зацікаўленні.

Светлая памяць пра светлага сябра беларускай культуры і літаратуры няхай жа застанецца ў прасторы нашай Айчыны назаўжды.

**Мікола БЕРЛЕЖ**

■ Экспертыза

# ПА «ВОГНЕННЫХ» СЛЯДАХ



**Шмат пажараў у краіне суправаджаецца працай судовых экспертаў. Толькі яны могуць высветліць, з-за чаго адбылося ўзгаранне. Асабліва калі гаворка ідзе пра кампенсацыю нанесенага агнём урону. Пра тое, як жа гэта адбываецца, «Звяздзе» расказаў галоўны эксперт аддзела спецыяльных экспертыз упраўлення спецыяльных і тэхнічных экспертыз Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Мінску Аляксандр БАЛОБАН.**

— Істотная колькасць экспертыз звязана з пажарамі ў аўтамабілях. Яны большую частку года эксплуатуюцца ў агрэсіўным асяроддзі. Для злучэнняў і ізаляцыі дождж, снег і мароз — умовы некамфортныя. Здараліся і выпадкі серыйных пажараў. Скажам, гарацъ машыны пэўных марак, аб праблемах у якіх дылер абвясціў яшчэ некалькі гадоў назад і пачаў адклікаць аўтамабілі для рамонту. Вось толькі звяртаюцца да іх не ўсе. А пасля заканчваецца гэта пажарам.

Таксама праблемнае месца ў аўтамабілі — гэта сажавы фільтр. У сучасных аўтамабілях гэтая частка выхлапной сістэмы не прадугледжана для таго, каб яна абслугоўвалася карыстальнікам у гаражы. Аднак на станцыю тэхнічнага абслугоўвання ехаць таксама лянота, ды і рамонт будзе-такі каштаваць грошай. Што робяць саматужныя ўмельцы? Напрыклад, заліваюць у сістэму падачы дызельнага паліва крыху бензіну. І тлумачаць гэта тым, што калі рэзка націснуць на педаль газу, то фільтр тут жа прагарыць і будзе працаваць добра. Але часцей за ўсё забіты фільтр ад такой маніпуляцыі проста разрываецца. А выхлапныя газы маюць тэмпературу ў 800 градусаў... Прычым бывае і так, што пажар не ўзнікае, але цеплавое ўздзеянне аплаўляе абшыўку, днішча, каробку перадач... Глядзіш на машыну — здаецца, што яна цэлая. А там столькі работы, што трэба мяняць большую частку начыння.

***— Наколькі актуальная праблема «кулібіншчыны»?***

Была нядаўна ў нас адметная экспертыза параўнальна новага аўтамабіля, якому крыху больш за чатыры гады. Нам трэба было высветліць прычыну пажару ў ім. Падчас агляду я знайшоў у нетрах машыны... кавалак ізастужкі савецкага часу, якая не магла знаходзіцца ў машыне па зразумелых прычынах. У скрутак праводоў нехта ўнёс змены. Але што тут зрабілі, мы не высвятляем. Справа ў тым, што эксперт вызначае менавіта тэхнічную прычыну здарэння. Многія чакаюць, што пройдзе экспертыза, і спецыяліст напіша, што работнікі СТА нешта накруцілі, што ў рэшце рэшт і прывяло да пажару. Але мы можам напісаць датычна гэтага выпадку толькі тое, што адбылося цеплавое праяўленне электрычнага току ў выніку вялікага пераходнага супраціўлення з аднаго ўчастка на другі, што і выклікала далейшае ўзгаранне. А кваліфікацыю дзеянням пэўных асоб дае толькі орган, які вядзе следства, і суд.

***— Якія электрычныя памочнікі ў побыце часцей за ўсё трапляюць на разгляд эксперту?***

— Што да электрапрыбораў, то і дагэтуль мы сутыкаемся з пажарамі, якія справакавалі лямпавыя тэлевізары з электронна-прамянёвай трубкай. Летась у Мінску нават гарэў інкубатар для яек.

У групу рызыкі паступова ўваходзяць блокі радыётэлефонаў, якія пастаянна падключаны ў разетку. Катушка індуктыўнасці, якая ў ім знаходзіцца, пры падачы высокага напружання пераходзіць у рэжым нагрэву. Так і адбываецца ўзгаранне. Радыёгадзіннікі, якія імкліва распаўсюдзіліся апошнім часам, таксама станавіліся аб'ектамі пажару. Быў выпадак, калі ў кватэру, дзе быў уключаны такі апарат, было пададзена высокае напружанне. А гаспадароў дома не было. Радыёгадзіннік імкліва загарэўся і спаліў увесь пакой... А вось халадзільнікі больш баяцца напружання паніжанага.

Чаму ўвогуле ўзнікае праблема скачкоў напружання? На жылы дом зыходна прыходзіць ток у 380 вольт. Так званы нулявы дрот выраўноўвае яго да паказчыка ў 220—240 вольт. Але нулявы дрот можа парвацца ў шчытку. Вось так у разетку і прыходзяць тыя самыя 380 вольт.

***— А калі пакінуць за дужкамі скачок напружання? Усё-такі, пэўна, ён не лідзіруе ў гэтым сумным спісе...***

— Для нас цяжкая пара — гэта восень. Звязана гэта з тым, што людзі вяртаюцца з адпачынкаў. І колькасць здарэнняў, а, як вынік, і экспертыз, павялічваецца шматкроць. Узяць хаця б тыя ж абагравальнікі. У нас іх чамусьці любяць выкарыстоўваць не толькі для стварэння цяпла, але і як сушылку. Але забываюць, што пры гэтым парушаецца цеплаадвод. І дайсці можа нават да таго, што ў апараце закіпіць масла. Падобная сітуацыя існуе і з аўтамабілістамі. Напрыклад, у халоднае надвор'е чалавек, які прыехаў увечары, хоча, каб рухавік да раніцы моцна не астыў. І закідвае яго старой вопраткай, коўдрамі, анучамі... Ідзе спаць, а ў гэты час пачынаецца тленне прадмета, які ў рэшце рэшт загараецца. Ноччу, як правіла, пакуль заўважаць пажар, можа прайсці даволі шмат часу. І пасля гаспадар аўто не разумее, як жа так здарылася: ён два гады так клаў рэчы, і ўсё было нармальна...

**У групу рызыкі паступова ўваходзяць блокі радыётэлефонаў, якія пастаянна падключаны ў разетку. Катушка індуктыўнасці, якая ў ім знаходзіцца, пры падачы высокага напружання пераходзіць у рэжым нагрэву.**

Між іншым, масавая аўтамабілізацыя мае яшчэ адзін нечаканы вынік: цяпер аўтамабілі гараць, так бы мовіць, комплексна. Раней жа было як: машын было мала, і гарэлі яны ў адзіночку. А цяпер яжа ўсё шчыльна запаркавана. Вось 15 ліпеня ў мяне быў выезд на месца такога пажару. На платнай стаянцы гарэў мікрааўтобус, які таксама падпаліў пяць іншых аўтамабіляў. Прычына здарэння ўжо высветлена: у маторным адсеку адбылося кароткае замыканне. А пакуль пажар заўважылі, пластыкавы паліўны бак ужо прагарэў, і бікфордавыя вогненныя шнуры пацяклі ўніз па асфальце, падпальваючы ўсё на сваім шляху.

***— Ці актуальная праблема пажараў у месцах агульнага карыстання шматпавярховікаў?***

— Нияк на вуліцы Казінца ў пад'ездзе шматпавярховага дома загарэўся тамбур. Прычым пажар быў такі моцны, што чагосьці падобнага я да гэтага не сустракаў. Той тамбур на шэсць кватэр быў загрувашчаны самым разнастайным побытавым хламам. Чаго там толькі не было: і бытавая тэхніка, і нейкія скрынкі, каробкі, банкі з фарбай і нават ёмістасці з ацэтонам. Адным словам, агню было на чым разгуляцца. І разгуляўся: адна з кватэр стала цалкам непрыдатная. Справа ў тым, што там дзверы былі драўляныя, а гаспадары астатніх паставілі сабе металічныя. Вось дрэва і прагарэла, і ў кватэру ўварвалася паветра з тэмпературай градусаў так 500. Аплавілася там усё: дзверы ўнутры хаты, падвесная столь і нават выключальнікі на сценах. Самае цікавае высветлілася пасля. Аказалася, што больш за ўсіх руку да загрузкі калідора прыклаў гаспадар кватэры, якая і пацярпела больш за ўсе астатнія. Чаму ж кажуць, што не трэба загрувашчваць калідоры? Бо гэта месца агульнага карыстання, за якім ніхто не сочыць. І куды нярэдка доступ вольны...

***— Як часта маскіруюць наўмысныя падпалы пад загаранне ад іншых прычын?***

— Такое здараецца, але эпідэмiяй назваць нельга. Матыў тут, як правіла, карыслівы. Жаданне атрымаць грошы па страхоўцы пераважае часам над пачуццём законнасці. Падчас чэмпіянату свету па хакеі 2014 года кампанія іншаземцаў заявіла пра тое, што ў іх скралі аўтамабіль. Машыну знайшлі літаральна праз некалькі гадзін у Валожынскім раёне. Заяву аб крадзяжы, канешне, прынялі, а пасля паказалі гасцям нашай краіны даволі цікавае кіно з кадраў, знятых вонкавымі відэакамерамі. Там было бачна, як заяўнікі селі ў аўтамабіль і паехалі за горад. А праз некалькі гадзін яны выйшлі з аўтамабіля таксі. Узнікла лагічнае пытанне: куды вы падзелі аўтамабіль?

***— А ці ёсць у вас, так бы мовіць, рэкардсмены па экспертызах?***

— А як жа. Толькі за ліпень мы правялі тры даследаванні па адной і той жа кватэры, якая гарэла на захадзе Мінска. Усе разы «адзначылася» адна і тая ж канапа. Людзей, якія там жывуць, даставілі тройчы ў бальніцу з атручэннем чадным газам. Можна толькі ўявіць, як сябе там пачуваюць суседзі з-за таго, што гаспадар кватэры курыць у ложку...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

*schklennik@zviazda.by*

# ВЕЛІЧ. ГЕНІЯЛЬНАСЦЬ. СВОЕЧАСОВАСЦЬ

500 гадоў беларускаму кнігадрукаванню
Напачатку было слова

## Да пытання аб кананізацыі Францішка Скарыны



**Хацеў бы пачаць з рытарычнага пытання: «А ці будзе калісьці кананізаваны Францішак Скарына?» Адказ на яго дасць толькі жыццё, прычым не за адзін-два гады, а на працягу найбліжэйшых дзесяцігоддзяў.**

Калі, дзе і ў каго зарадзілася гэтая ідэя? Думаецца, што падчас творчай вандроўкі беларускай інтэлігенцыі ў ліпені—жніўні 1989 года ў Прагу і Кракаў. Пасля яе, у пачатку 1990-х гадоў мінулага стагоддзя, займаючыся ўвекавечаннем памяці Скарыны ў свеце і папулярызацыяй яго спадчыны за мяжой, я ўсё больш разумеў маштабнасць і унікальную значнасць гэтай постаці ў духоўным сэнсе. Невыпадкова ў сваёй прамове ў Падуанскім універсітэце 20 кастрычніка 1992 года, прысвечанай адкрыццю мемарыяльнай дошкі ў яго гонар, я ахарактарызаваў яго дзейнасць як прыклад Нацыянальнага Месіянства. Магчыма, гэта было эмацыянальнае перабольшанне, выкліканае імкненнем не проста аддаць яму належнае, а ўславіць і ўганараваць духоўна-адукацыйную і выхаваўча-ўтваральную ролю Скарыны ў самаідэнтыфікацыі нашага народа.

Адносна яго жыцця, дзейнасці і спадчыны мне падаецца, што асоба Скарыны не можа быць дасканала і ўсебакова вызначана і ахарактарызавана. Бясспрэчна адно: веліч, геніяльнасць і своечасовасць з'яўлення яго на небасхіле нацыянальнай гісторыі. Менавіта разуменне гэтага прывяло да таго, што ў 2014 годзе група нацыянальнай інтэлігенцыі стварыла Міжнародны аргкамітэт па кананізацыі Францішка Скарыны. Асноўная мэта — папулярызацыя і вывучэнне яго жыцця і творчасці, а таксама верагодная магчымасць далучэння яго да ліку святых.

З гэтай мэтай у сярэдзіне 2014 года мною і Адамам Мальдзісам, як сакратаром аргкамітэта, былі зробленыя ў сродках масавай інфармацыі адпаведныя заявы. Яны выклікалі ў грамадстве неадназначную рэакцыю: ад падтрымкі да крытычных і нават часам здзеклівых каментарыяў.

Асноўная контраргументацыя зводзілася да таго, што няма сведчанняў беззаганнага жыцця Скарыны, а таксама зафіксаваных трох яго цудаў.

Мне здаецца, што адносна такой унікальнай асобы, як Скарына, традыцыйна-класічны кананічны падыход не адпавядае маштабу, ролі і значнасці постаці нашага першадрукара. Галоўны цуд Скарыны — гэта пераклад Біблії, дзякуючы якому не асобныя людзі сталі відушчымі ці аднавілі слых, а стаў відушчым увесь наш народ. Геній Скарыны заключаўся ў тым, што ён дзвюма-трыма кнігамі адчыніў дзверы з цемры і вывеў людзей на святло, увёў у агульналюдскую, агульнаеўрапейскую сям'ю, у пантэон гуманістычнай культуры нашага кантынента, заявіў аб праве беларускага народа на нацыянальна-культурнае вызначэнне. А возьмем у якасці прыкладу кананізацыю Кірыла і Мяфодзія, якія былі прылічаныя да святых не за нейкія канкрэтныя цуды, а за галоўны подзвіг іх жыцця — распрацоўку кірылічнага алфавіта, якім сёння карыстаюцца многія славянскія народы. Ці — апошняя навіна пра тое, што ў Чылі пачынаецца працэс кананізацыі Ігната Дамейкі, галоўны цуд якога, далёкі ад канանічнага, звязаны з асветай, навукай, адкрыццём універсітэта, што дало магчымасць з'явіцца на свет чылійскай нацыі.

Мы падрыхтавалі зварот да Яго Экселенцыі Архібіскупа Апостальскага Нунцыя ў Рэспубліцы Беларусь пана Клаўдыя Гуджэроці: «Інфармуем Вас, што ў нашай краіне створаны і пачынае працаваць Міжнародны грамадскі камітэт па кананізацыі беларускага і ўсходнеславянскага першадрукара, перакладчыка Біблії на старабеларускую мову і аўтара прадмоў і пасляслоўяў да першага сярод усходнеславянскіх народаў выдання Святога Пісання Францыска (Францішка) Скарыны. Яго напружаная праца — гэта сапраўдны жыццёвы подзвіг. Ён сведчыць пра веліч і аўтарытэт гэтай постаці ў агульнасусветным духоўным кантэксце.

Мы звяртаемся да Вас, Ваша Экселенцыя, з просьбай аказаць нашаму аргкамітэту неабходную дапамогу на няпростым, але пачэсным шляху да кананізацыі гэтай Асобы, якая па праве лічыцца стваральнікам беларускай нацыі. Чалавека, беззаганнага маральнага хрысціяніна, які карыстаецца павагай сярод католікаў, праваслаўных і уніятаў».

Гэты зварот падпісалі старшыня аргкамітэта, яго сакратар доктар філалагічных навук прафесар Адам Мальдзіс, доктар гістарычных навук Георгій Галенчанка, кандыдаты філалагічных навук Алесь Жлутка, Вячаслаў Чамярыцкі, Язэп Янушкевіч, скульптар Валерый Янушкевіч і многія іншыя.

Хачу падкрэсліць, што рэакцыя пана Клаўдыя Гуджэроці была дастаткова станоўчая. Ён некалькі разоў сустракаўся з членамі аргкамітэта і запэўніў нас, што будзе інфармаваць пра нашу ініцыятыву кіраўніцтва Ватыкана. Ён параіў больш актыўна займацца папулярызацыяй беззаганнага жыцця, творчасці гэтай асобы ў сродках масавай інфармацыі і асабліва сярод вернікаў. Пан Гуджэроці выказаў слушную прапанову, што асноўны акцэнт перш-наперш трэба рабіць на верніках малой радзімы Скарыны — Полаччыны і Віцебшчыны, якія маглі б выступіць з ініцыятывай адпаведнай інтэнцыі. У сувязі з тым, што ў той час актыўна абмяркоўвалася магчымасць прыезду на Беларусь Папы Рымскага Францішка, ён параіў, каб самі вернікі пасля адна-го з магчымых яго багаслужэнняў у Мінску актуалізавалі гэтае пытанне ў непасрэдным звароце да Яго Святасці. Мы абсалютна былі згодныя з ім і перакананы таксама сёння, што толькі шырокая падтрымка гэтай ідэі сярод вернікаў вырашае сутнасць справы, яе верагодны поспех у будучыні.

Хачу таксама з задавальненнем адзначыць, што сёлета, 2 верасня, на ўрачыстасцях у Полацку, прысвечаных Дню беларускага пісьменства, прагучала наступная заява мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Паўла, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі: «Цяперашняе свята — гэта падстава для таго, каб азірнуцца на гістарычнае мінулае беларускага народа і падумаць, што было б, калі б не было святых роўнаапостальных Кірыла і Мяфодзія, першадрукара Францыска Скарыны. Цяжка сабе ўявіць, але гэта падстава для роздуму. Гэтыя людзі, якія ўнеслі важкі ўклад у беларускую гісторыю і культуру, далі такі зарад энергіі, які і дагэтуль натхняе іншых на творчыя справы».

А далей — прамы аналаг з гістарычным подзвігам Скарыны па перакладзе Святога Пісання на беларускую мову: «Хачу сказаць, што літаральна некалькі тыдняў таму яшчэ адзін значны плод быў прынесены Беларускай праваслаўнай царквой нашаму народу. Больш за 25 гадоў нашы навукоўцы, лінгвісты, славісты, перакладчыкі працавалі над перакладам кніг Святога Пісання Новага Запавету. І сёння ў Полацку мы прэзентавалі Новы Запавет на сучасны беларускай мове. Хачу сказаць, што гэта таксама гістарычная падзея, яшчэ адзін крок для таго, каб нашы людзі спазнавалі Бога, вучыліся любіць адзін аднаго, маглі бачыць жыццё ў міры, згодзе і аднадумстве».

**Падсумоўваючы вышэйсказанае, хачу адзначыць наступнае:**

✓ Мы, сябры аргкамітэта, якія прадстаўляюць пэўную частку нацыянальнай інтэлігенцыі, бачым сваю задачу толькі ў тым, каб актуалізаваць, паставіць на парадак дня гэта пытанне, распачаць на свецкім узроўні яго абмеркаванне ў сродках масавай інфармацыі і паступова перадаць на разгляд вернікаў, адышоўшы ўбок. Мы павінны будзем засяродзіць сваю ўвагу і працу перш за ўсё на паглыбленні і вывучэнні яго жыцця, рознабаковай дзейнасці Скарыны, папулярызацыі яго духоўнай спадчыны.

✓ Асноўная функцыя нацыянальнай інтэлігенцыі, якая валодае дарам прадбачання, у гэтым выпадку — даць новы імпульс духоўнаму выхаванню і развіццю нашага народа, яго сапраўднаму нацыянальнаму адраджэнню, імкнуцца падняцца над штодзённасцю жыцця, зазірнуць крыху наперад, прагназаваць магчымае развіццё падзей у культурнай і духоўнай сферах цягам гэтага стагоддзя.

✓ Перакананы, што кананізацыя Скарыны — гэта важкі і сур'ёзны крок на шляху выжывання, кансалідацыі і завяршэння працэса фарміравання беларускай нацыі ў няпростых умовах глабалізацыі і ўніверсалізацыі, калі патэнцыйна мы можам «распыліцца імглой між чужых».

✓ Духоўны імператыў жыцця Скарыны — гэта пераадоленне шматканфесійнасці як асноўнай прычыны нашай трагічнай раздвоенасці і адсутнасці еднасці. Мы не сталі тыповым народам Усходу, але не прынялі цалкам і культуры (у сэнсе ідэалогіі, веры) Захаду. Але грунтуючыся на запаветах Скарыны, ва ўмовах цывілізаванага XXI стагоддзя, у культуралагічным сэнсе, гэта можа быць не столькі адмоўнай, а дастаткова прыцягальнай, станоўчай субстанцыяй і рысай. Трэба імкнуцца да гарманічнага сімбіёзу, фарміравання ў псіхалагічным і культурным сэнсе трэцяй якасці. Менавіта са спалучэння візантыйска-праваслаўнага пачатку, напоўненага велізарнай духоўнасцю і самаахвярнасцю, і каталіцкага, з непаўторнай шчырасцю і адданасцю веры, а таксама прагматычна-рацыянальнага пратэстанцкага пачатку, аздобленага этыкай працавітасці і ціпласці, можна сфарміраваць нашу адметнасць, нашу новую нацыянальна-псіхалагічную сутнасць. У выхаваўчым сэнсе неабходна стварыць новую культурную якасць. Трэба зрабіць так, каб нашы дзеці не проста добра ўяўлялі, а глыбока ўспрымалі і ў штодзённым жыцці і працы выкарыстоўвалі каштоўнасці гэтых двух вялікіх рэлігійна-культуралагічных уплываў, бралі лепшае ў кожным з іх.

✓ Хрысціянін Францыск (Францішак) Скарына — дарагі і шанаваны ўсімі беларусамі незалежна ад іх канфесійнай прыналежнасці, сацыяльнага статусу, полу і ўзросту.

✓ Што ў рэшце рэшт атрымаецца з нашай шчырай ініцыятывы, накіраванай на духоўны ўздым нашага народа, пакажа толькі час. І адзіным арбітрам у гэтым будуць простыя вернікі і Яго Вялікасць беларускі народ.

**Пётр КРАЎЧАНКА.**

**Багатае на гісторыю мястэчка Дзярэчын, што на Гродзеншчыне, у 2016 годзе адсвяткавала сваё 600-годдзе. У Дзярэчыне, куды ў свой час Сапегі перанеслі з Ружан рэзідэнцыю, былі палац з 22 пакояў, кляштар з касцёлам, тэатр, заапарк. Да нашых дзён, на жаль, захаваліся толькі ўспаміны і муры. Многія дзярэчынцы не ведаюць, дзе стаялі палац і кляштар. У школьным музеі не знайшлося месца нават для невялічкага стэнда пра гісторыю Дзярэчына...**

■ Практычнае радзімазнаўства

# ЗАБЫТАЯ КАЛОНА



Калона, што стаіць на ўездзе ў Дзярэчын з боку Гродна.

Хачу звярнуць увагу на наступную цікавую акалічнасць: аб палацы Сапегаў, кляштары дамініканаў ёсць шмат інфармацыі — хто, калі іх пабудаваў, бо засталіся малюнкі Напалеона Орды. І наадварот, на ўездзе ў Дзярэчын з боку Гродна (далькей каля вёскі Алексічы, што за 100 метраў ад Дзярэчына) стаіць высокая цагляная калона. Пра яе мала што вядома.

Чытаючы пра гісторыю роднага мястэчка, я знайшоў магчымыя прычыны ўзнікнення гэтай калоны. Яе ўсталявалі падчас Паўночнай вайны Швецы з Маскоўскай дзяржавай у 1700—1721 гадах, тады Сапега выступаў на баку Швецыі. Ёсць версія, што калону паставілі ў гонар канстытуцыі 1791 года Рэчы Паспалітай, куды ўваходзіла наша дзяржава Вялікае Княства Літоўскае (канстытуцыя была першым у Еўропе і другім у свеце, пасля канстытуцыі ЗША, асноўным законам, які падзяліў тры галіны ўлады). Магчыма, усталяванне помніка недалёка ад палаца звязана з прыналежнасцю гэтага ўладання роду Сапегаў.

Цікава, што каля кляштара дамініканаў у Дзярэчыне стаяла яшчэ адна калона. Святар Іосіф Карскі, які служыў у дзярэчынскай царкве ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя, пісаў наступнае «...гэтыя слупы пастаўлены ў памяць місіі ордэна дамініканаў». На карысць гэтай версіі можа ўказваць тое, што на калоне раней быў крыж, які не захаваўся да нашых дзён.

На сённяшні дзень калона — амаль страчаны гістарычны аб'ект: яму больш за 200 гадоў, але ніхто ім не апякуецца, дакладна не вядома, калі і ў гонар чаго яна была ўсталявана...

Я спрабаваў распачаць працэс па ўключэнні калоны ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў, але мае спробы пакуль плёну не далі. Верагодна, тут дапамаглі б звесткі знаўцаў, што маюць доступ да архіваў Варшавы, Вільнюса.

Звяртаюся са старонак вашай газеты да спецыялістаў, якія маюць досвед у такіх справах: дапамажыце, а то ў хуткім часе ад калоны можа застацца толькі ўспамін. Ведаю, што ў Беларусі ёсць некалькі падобных калон. Буду ўдзячны за любую карысную інфармацыю.

**Сяргей БУЦЬКО.**

*Дзярэчын, Гродзеншчына.*



**Калісьці каля кляштара дамініканаў у Дзярэчыне была яшчэ адна калона.**

■ Дзеля памяці

# БЕЗ ВІНЫ

## «Страчаныя аблічча» — у Літаратурным музеі Янкі Купалы

**Выстава «Страчаныя аблічча», што днямі адкрылася ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы, па-свойму ўнікальная. Гэта праект-мемарыял, прысвечаны беларускім літаратарам, якія пацярпелі ад рэпрэсій у 1920—1950-я гады. У адной экспазіцыі сабраныя асабістыя рэчы, дакументы, рэдкія зборнікі твораў, а таксама пратаколы з допытаў і нават рэчы, знойдзеныя ў Курапатах. Прадметы, выстаўленыя тут, не толькі з Літаратурнага музея Янкі Купалы: да справы падключыліся, прадставіўшы свае фонды, Музей гісторыі беларускай літаратуры, Архіў-музей літаратуры і мастацтва, Нацыянальны гістарычны музей. Невялікі экскурс па выставе для чытачоў «Звязды» зладзіў куратар Павел КАРАЛЁЎ:**



«На выставе можна ўбачыць увесь працэс пераследу літаратараў: спачатку падазрэнне ў прыхільнасці да нацыянальнай ідэі, затым першыя арышты, допыты, пасля высылкі і, у рэшце рэшт, расстрэл. Мастацкае ўвасабленне, створанае Аляксандрам Давідовічам, дазваляе нам адчуць гэта вельмі поўна.

На месцы сённяшняга музея Янкі Купалы калісьці стаяў яго дом, куды завіталі калегі, знаёмыя. Адсюль ён, можна сказаць, дабраслаўляў многіх людзей на паэзію. І тут зведаў шматлікія пакуты, калі яго пачалі выклікаць на допыты ў ДПУ па так званай справе «Саюза вызвалення Беларусі» (сёння зразумела, што такой арганізацыі насамрэч не існавала).



Можна ўбачыць пратаколы, падпісаныя на допытах рукой Янкі Купалы. Ён гаворыць пра сваю п'есу «Тутэйшыя» і кажа, што не можа зразумець, у чым яго абвінавачваюць? І якая можа быць віна ў тым, што дома збіраліся сябры і калегі?.. Калі прыйшоў час прызнаць віну і назваць тых, што яшчэ вінаваты... У некалькіх месяцах пратаколаў занатавана, што Янка Купала «не ідзе на супрацоўніцтва і ісці не хоча».

Допыты былі адной прыкметай таго часу. А другой — узнагароды. Купалу ўзнагародзілі ордэнам Леніна, Сталінскай прэміяй — можна ўбачыць адпаведныя дакументы. Гэта была двайная сітуацыя, і паэт яе добра разумеў. Праз пяць дзён пасля допыту ён піша запіску на імя Чарвякова (за пяць дзён да спробы самагубства): «Уміраю, зважаючы на тое, што лепш смерць фізічная, чым незаслужаная смерць палітычная. Відаць, такая доля паэтаў. Застрэліўся Ясенін, павесіўся Маякоўскі. Ну і мне туды за імі дарога». Паэт спрабаваў забіць сябе, усадзіўшы нож у жывот. Але маме з жонкай, якія знаходзіліся непадалёк, удалося яго ўратаваць. У экспазіцыі прадстаўлены нож, знойдзены на калісьці на папялішчы Купалавай хаты, можа быць, той самы нож...

Маецца рарытэтны рукапіс, у якім Уладзіслаў Чаржынскі ў сваіх выпісках з беларускай літаратуры алоўкам закрэсліваў імёны тых, хто ўжо арыштаваны, — Язэпа Лёсіка, Усевалада Ігнатоўскага, Максіма Гарэцкага.

Можна ўбачыць кнігу з творамі Купалы за 1918—1928 гады. Асобнікаў гэтага выдання засталося зусім няшмат. Бо яго наклад у 1930 годзе не пусцілі ў продаж. Ёсць сведчанні, што старонкі кнігі выкарыстоўвалі проста для абгортак у крамах.

У цэнтры залы можна ўбачыць аблічча, якія для нас сёння ў многім страчаны... Дзмітрый Прышчэпаў, Аляксандр Цвікевіч, Язэп Пушча і іншыя. Гэта ўсё сябры Янкі Купалы. І лёс кожнага з іх для паэта мусіў быць поўнай асабістай трагедыяй, калі ён даведваўся пра чарговае няшчасце.

Выстава прысвечана ў тым ліку і Цішку Гартнаму, з дня нараджэння якога сёлета спаўняецца 130 гадоў. Менавіта Змітрок Жылуновіч падпісваў дэкларацыю аб стварэнні ССРБ. Аднак, на жаль, далейшы лёс склаўся трагічна. У 1930-я гады ён быў пазбаўлены многіх пасад. Жыццёвы шлях абарваўся ў Магілёве пры да канца не высветленых абставінах. У экспазіцыі можна пабачыць сямейныя здымкі Цішкі Гартнага — з жонкай, з дзецьмі. Таксама прадстаўлены дакументы, у якіх жонка Гартнага ў пазнейшыя часы дамагалася яго рэабілітацыі.

На стэндзе за шклом можна ўбачыць два прыгожыя ручнікі — адзін Максіму Гарэцкаму вышывала мама, другі Міхасю Чароту — яго цётка. Раней такія ручнікі рабіліся, калі дзяцей выпускалі ў свет... Але хто ж мог ведаць, што іх выпраўлялі ў зусім іншую, незваротную дарогу.

На выставе змешчаны фотаздымак Міхася Чарота. Ужо калі патрапіў у турму, ён напісаў на сцяне такі верш:

*«Прадажных здрайцаў*
*ліхвяры*
*Мяне зацікнулі за краты.*
*Я прысягаю вам, сябры,*
*Мае палі,*
*Мае бары,*
*Кажу вам — я не вінаваты,*
*Паверце — я не вінаваты».*

Шматлікія дакументальныя сведчанні распавядаюць пра тое, як хутка ў той час рабіліся абвінавачванні. Напрыклад пасведчанне Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі на імя Алеся Пальчэўскага было выдадзена ў 1936 годзе. А ўжо праз пару месяцаў яго арыштавалі. Звычайна ў такіх пасведчаннях кожны год ставілі новую пячатку. Гэта ж так і засталося з толькі адной пазнакай.

Сярод самых трапяткіх і кранальных рэчаў — крохкая галінка верасу, засушаная Уладзімірам Дубоўкам, які зведаў не адну высылку. Такія прадметы сведчаць пра тое, што рэпрэсіўная машына не магла супрацьстаяць галоўнаму — любові да Беларусі і да тых, хто побач.

Тут жа можна ўбачыць і вышыўку «Поўнач», зробленую ў лагеры ў Інце. Яна вышыта непасрэдна на лагернай вопратцы Зояй Коўш — дачкой вядомага дзеяча, святара Аляксандра Каўша, — дзяўчына таксама зведала, што такое сталінскія лагеры.

Сяргей Новік-Пяюн, Ларыса Геніюш, Андрэй Александровіч, Максім Гарэцкі, Аркадзь Смоліч, Алесь Дудар — рэчы, што маюць дачыненне да гэтых творцаў, таксама прадстаўлены ў «Страчаных абліччах».

Па-свойму ўнікальны вялікі фотаздымак першай прэм'еры «Паўлінкі» ў Маскве, 1913 года. На ім можна ўбачыць маладога Купалу, адну з першых выканальніц галоўнай ролі, Паўліну Мядзёлку, таксама Браніслава Тарашкевіча. Гэта вельмі вядомае фота, але яно мае незвычайную гісторыю... Справа ў тым, што на ім зацёрта некалькі асоб. На выяве выдрапана і зафарбавана месца, на якім быў Аркадзь Смоліч — вядомы дзеяч, аўтар «Геаграфіі Беларусі». Верагодна, яго зацёрлі, каб не паказваць сувязь з чалавекам, якога ўжо арыштавалі, — гэта было непажадана. Побач у экспазіцыі размешчаны такі ж здымак, дзе яшчэ ёсць выява Аркадзя Смоліча. Яшчэ ў аднаго чалавека бачыцца бы дамаляваная барада.

На інсталяцыі «Пасля вобшуку» перакулены рэчы, раскіданы кнігі... На адным са змятых аркушаў, што ляжаць на падлозе, калі яго разгарнуць, можна прачытаць верш Алеся Дудара «Пасеклі край наш» (у свой час яго перадавалі з рук у рукі). За адзін гэты твор паэт атрымаў першую высылку ў Смаленск.

У асобнай экспазіцыі выстаўлены рэчы, знойдзеныя пры раскопках у Курапатах, — гузікі, акуляры, гільзы, муштукі. На адным грабеньчыку з аднаго боку напісана: «Цяжкія хвіліны зняволенага. Мінск 25.04.1940. Думка пра вас даводзіць мяне да роспачы». А на адвароце гэтага грэбеня можна прачытаць: «26.04. Расплакаўся. Цяжкі дзень».

Сярод выяў тых, хто быў расстраляны ў тую страшную ноч, — Уладзіслаў Галубок, Міхась Чарот, Адам Бабарэка, Платон Галавач і іншыя.

Пэўнай іроніяй выглядае паштоўка з асабістага архіва Міхася Чарота. На яе пярэднім плане пазначана дата — сакавік 1917 года. Кагосьці вызвалялі з турмы пасля Лютаўскай рэвалюцыі, і на паштоўцы напісана: «Таварыш, вы свабодны». Але іншай рукой, з самага верху, дапісана пытанне: «Вы, я, хто свабодны?»

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*




■ Сваімі словамі



# «А ПАЖАРУ КРЫВІ НЕ СТУШЫЦЬ...»

**Ім было так няшмат. Гадоў 26, 28, камусьці больш. Хтосьці скажа, дзеці яшчэ! Але тыя, каму было наканавана стаць нашымі айцамі, вырасці не паспелі... Так і жывём. Са звяном, што выпала з ланцуга памяці. Чым і як замяніць гэту пустэчу? І ці здольныя мы?**

Сёлета спаўняецца 80 гадоў з часу той страшнай ночы — з 29 на 30 кастрычніка 1937 года было расстраляна больш за 100 дзеячаў беларускай культуры, сярод якіх — 22 літаратары. Многіх да іх «далучылі» раней ці пазней. У жывых, з усяго пакалення, засталіся, па сутнасці, Янка Купала і Якуб Колас. Але не стала Уладзіслава Галубка, Браніслава Тарашкевіча, Вацлава Ластоўскага... І цэлай плеяды паэтаў, у сэрцах якіх ужо выспела літаратура... Але свой плод прынесці не паспела.

Часам думаецца: а што, калі б усе тыя творцы засталіся жыць?.. Максім Гарэцкі, напрыклад, хоць і напісаў няшмат, але некаторыя даследчыкі мяркуюць, што менавіта ён — найгалоўнейшы наш класік (калі ўвогуле можна праводзіць такую ратацыю). У яго адмысловы імпрэсіяністычны стыль, адметнымі сродкамі ён перадае каларыт і атмасферу, творы маюць цікавы, глыбокі псіхалагізм. Каб пажыў ён яшчэ хоць бы гадоў дзесяць, мы мелі б сапраўдныя шэдэўры, што, без сумневаў, увайшлі б у пантэон сусветнай класікі.

Не паспелі раскрыць свой талент шматлікія паэты. Анатолю Вольнаму было ўсяго 26 гадоў. Алесю Дудару — 33, Міхасю Зарэцкаму — 36, Юрку Лявоннаму — 29, Юлію Таўбіну — 26. Вядома ж (а дакладней, на жаль), сёння яны, як і многія іншыя рэпрэсаваныя дзеячы таго часу, не на слыху. Іх творы не вывучаюць у школе. І не таму, што маладыя сышлі з жыцця. Усё значна прасцей — яшчэ цэлыя дзесяцігоддзі пасля іх смерці не прынята было ўключаць такіх літаратараў у даследаванні. Іх не толькі фізічна знішчылі. Галоўны скарб, створаны імі, — літаратуру — таксама трымалі ў лепшым выпадку ў спецсховах. Тое, што ацалела, — часцей за ўсё выпадкова. Але са страшнага шэрагу небыцця да нас усё ж такі далятаюць радкі. Як, напрыклад, гэтыя, напісаныя Валерыем Мараковым у 1927 годзе:

*«...Не табе, не з табой я маліўся,*
*Ну й за гэта сягоння даруй,*
*Не шкада, што на свет нарадзіўся,*
*Не шкада, што калісьці пямру.*

*Не шкада, што ў вячэрнім тумане*
*Мёртвы месяц пажарам гарыць*
*І на белыя грудзі курганаў*
*Льюцца слёзы крывавай зары.*

*Ах, сягоння ля гэтай дубровы*
*Хочу жыць, яшчэ хочу я жыць,*
*Бо кахаць ты не будзеш нанова,*
*А пажару крыві не стушыць...»*



**Валерыю МАРАКОВУ было 28 гадоў, калі яго расстралялі.**

Узнёсла разважаючы пра жыццё і нябыт, малады паэт, якому было тады ўсяго 18, наўрад ці думаў, што смерць напаткае яго ўжо праз дзесяць гадоў.

Многа страчана імёнаў. Маладыя людзі паспелі заявіць пра свае яскравыя таленты, але належным чынам уславіць родную Беларусь ім не далі... Што рабіць з гэтай пустэчай, з гэтай белай плямай у культурнай прасторы, дагэтуль незразумела. Можа народу трэба пакаяцца?

Усім хацелася б думаць, што яны нашчадкі паэтаў (але быць дзецьмі тых, хто памёр маладым, таксама не надта радасна). Але, відавочна, хтосьці ж мусіць паходзіць і ад тых, хто расстрэльваў ці аддаваў такія загады... Тэрмін даўнасці, калі б яшчэ можна было знаходзіць вінаватых, даўно мінуў. Ды ні, мусіць, і не патрэбна. Але нават псіхолагі раяць разбірацца са сваім мінулым, прапрацоўваць даўнія траўмы, выносіць на паверхню застарэлы боль — і тады ён насамрэч адпусціць.

Беларусы — досыць унікальная нацыя. Міралюбівая, шчырая, таленавітая, годная. І ў той жа час вельмі няўпэўненая ў сабе і ў нечым нават слабая. Чаго мы баімся? За што падсвядома адчуваем віну?..

Падаецца, лёд зрушыўся з месца, крыгі пацяху вызваляюць рэчышча ракі. Пацвярджэнне таму — выстава «Страчаныя аблічча», што адкрылася ў Літаратурным музеі Янкі Купалы. У інтэрнэце ствараюць сайты з імёнамі рэпрэсаваных продкаў, дзе можна паспрабаваць адшукаць сваякоў. Зараз ладзіцца праект «(Не)расстраляная паэзія». У кастрычніку і першай палове лістапада ў кнігарні «Логвінаў» увечары па пятніцах можна завітаць на лекцыі пра аднаго з расстраляных паэтаў — ды паслухаць музыку гуртоў, што напісалі творы на іх вершы. Канцэртная прэм'ера праекта «(Не)расстраляная паэзія» адбудзецца ў клубе «Бруге» 29 кастрычніка.

Не ўсе нарывы на целе гісторыі XX стагоддзя ўскрытыя. Яны будуць балець, слаба ныць (хоць часам быццам незаўважна), пакуль мы не звернем на іх увагу і не вылечым. Толькі так, з цяжкасцю выплаўляючы золата з бруднага металу, мы знойдзем сапраўдных сябе.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

■ Чалавек

# ЧАМУ МЫ ТАЎСЦЕЕМ З УЗРОСТАМ



**Узроставыя кілаграмы з'яўляюцца з-за таго, што імунітэт, які старэе, умешваецца ў дыялог паміж нервовай сістэмай і тлушчавай тканкай, замінаючы тлушчавым клеткам спальваць свае запасы.**

Пажылыя людзі схільныя да паўнаты — хай не ўсе, але многія. І нават калі ў маладосці ў чалавека была нармальная вага, вялікая верагоднасць, што з часам яна выйдзе з-пад кантролю. Больш за тое, пажылым скінуць лішнія кілаграмы звычайна бывае няпроста, нягледзячы на ўсе прынятыя намаганні.

Даследчыкі з Еля мяркуюць, што ўзроставай паўнатой мы абавязаны імунітэту, які да старасці пачынае барахліць. Імунныя клеткі ёсць у самых розных тканках і органах, ёсць яны і ў тлушчавай тканцы таксама. Праблема ў тым, што імунныя макрафагі (спецыяльныя клеткі, чыя задача — сачыць за інфекцыяй і своечасова біць трывогу), якія сядзяць у брушным тлушчы, з узростам пачынаюць без патрэбы генерыраваць запаленчыя сігналы, а гэтыя сігналы, у сваю чаргу, у літаральным сэнсе дзейнічаюць на нервы, якія пранізваюць тлушчавую тканку.

Нервовая сістэма напрамую абменьваецца інфармацыяй з тлушчавымі клеткамі: гармоны з тлушчавай тканкі дзейнічаюць на гіпаталамус у мозгу, і ў адказ да тлушчавых клетак па нервах прыходзіць каманда спаліць лішак назапашаных ліпідаў. Высветлілася, што макрафагі, якія знаходзяцца ва ўзрушаным стане, перакрываюць канал зносін паміж тлушчавай тканкай і нейронамі. У артыкуле ў Nature гаворыцца, што імунныя клеткі руйнуюць нейрамедыятары, з дапамогай якіх нервы перадаюць тлушчаспаленчы сігнал.

У эксперыментах з пажылымі мышамі атрымалася паказаць, што калі ў іх макрафагі падаўлялі актыўнасць запаленчых рэцэптараў, то тлушч у старых мышэй пачынаў расшчапляцца з той жа хуткасцю, што і ў маладых. Ёсць і іншы спосаб амаладзіць імунныя клеткі — задушыць актыўнасць ферменту, які назапашваецца ў іх па меры старэння. Фермент гэты завецца монаамінааксідаза-А, ці МААА, пра які часта можна пачуць, што ён звязаны з рознымі псіханеўралагічнымі праблемамі. Некаторыя антыдэпрэсанты прымушаюць актыўнасць МААА, і, магчыма, у перспектыве на іх аснове атрымаецца зрабіць пэўныя прэпараты, якія будуць забяспечваць нармальныя зносіны паміж тлушчавай тканкай і нервамі, нармалізуючы тым самым тлушчавы метабалізм.

Дзеля справядлівасці варта нагадаць, што не так даўно часопіс «Навука і жыццё» пісаў пра даследаванні супрацоўнікаў Медыцынскага цэнтра Маўнт-Сінай, якія прыйшлі да высновы, што імунныя макрафагі не ўплываюць на тое, як тлушчавая тканка спальвае тлушч, і не ўмешваюцца ў дыялог нервовай сістэмы і тлушчавых клетак. Зрэшты, магчыма, што тут уся справа ва ўзросце — хоць імунітэт ніяк не дапамагае спальваць тлушч у маладосці, але ў старасці ён цалкам можа пачаць гэтаму перашкаджаць ■



Макрафагі, якія сядзяць на нервах, што праходзяць скрозь тлушчавую тканку.

■ Дайджэст



Партрэт скіфа — фрэска на будыйскай ступе.

# КАЧЭЎНІКІ-СКІФЫ ЖЫЛІ І Ў ДАМАХ?

**На мяжы з Манголіяй знойдзены скіфскія малюнкі, якія могуць змяніць уяўленне пра лад жыцця качавых плямёнаў.**

Скіфы гаспадарылі ў еўразійскіх стэпах у I тысячагоддзі да н. э. Яны перамяшчаліся па стэпавым поясе Еўразіі ад Паўночнага Кітая на ўсходзе да Паўночнага Прычарнамор'я на захадзе. Яны не былі адзіным народам, і цяпер немагчыма дакладна вызначыць месца пражывання кожнага этнасу, які да іх адносяць, але ўстаноўлена, што рух гэтых качэўнікаў ішоў хвалямі з усходу на захад.

Сёлета, па дамове з музеем сям'і Рэрыха, Тувінская экспедыцыя Інстытута гісторыі матэрыяльнай культуры РАН працавала на мяжы Манголіі і Тывы з мэтай вывучэння помнікаў наскальнага мастацтва і пахавальных помнікаў эпохі бронзы і ранняга скіфскага часу. У мінулым палявым сезоне археолагі знайшлі цэлы комплекс абеліскаў — аленных камянёў і мноства наскальных малюнкаў. Аленныя камяні ўсталёўвалі побач з пахаваннямі: яны звычайна адлюстроўваюць постаць скіфа, якому прысвечаны помнік, таксама на іх малявалі зброю і жывёл. Вялікую цікавасць выклікаюць наскальныя малюнкі з выявай бытавых сцэн. Іх зрабілі ў розны час — ад эпохі бронзы ў III тысячагоддзі да н. э. і да этнаграфічнай сучаснасці. На некаторых малюнках можна ўбачыць дамы бронзавага веку.

Паводле слоў кіраўніка экспедыцыі, старшага навуковага супрацоўніка Аддзела археалогіі Цэнтральнай Азіі і Каўказа ІГМК РАН Марыны Кілуноўскай, «... лічыцца, што качэўнікі жылі ў юртах, але на скалах яны малявалі звычайныя дамы з дахамі, часам малявалі дом у плане, падзелены на некалькі адсекаў. У іх намаляваны чалавечкі — мужчыны, жанчыны, дзеці. Побач з дамамі намаляваныя статак, дарога, людзі, якія палююць на жывёл. Такія выявы знойдзены ўпершыню. Тут зашыфравана нейкая інфармацыя аб іх ладзе жыцця, і яе трэба будзе яшчэ расшыфраваць».



# СПЕЦСЛУЖБЫ СТРАЛЯЮЦЬ З-ЗА ВУГЛА

**Гісторыкі пішуць, што ідэя прымусіць кулю ляцець па выгнутай траекторыі прыйшла ў галаву рускаму ваеннаму інжынеру Маеўскаму яшчэ ў 1868 годзе. Аднак усур'ёз за стральбу з-за вугла ўзяліся толькі да пачатку Другой сусветнай вайны. У Савецкім Саюзе эксперыментавалі са здымнымі выгнутымі стваламі танкавых і стацыянарных кулямётаў, але ідэя не прыжылася з-за малой дакладнасці і кучнасці стральбы з крывых ствалоў, да таго ж самі ствалы даволі хутка зношваліся.**

Сёння на ўзбраенні спецслужбаў ёсць толькі адна сістэма ў рабочым стане, якая дазваляе страляць з-за вугла — ізраільскі CornerShot і яго мадыфікацыі. Акрамя таго, ёсць падобная прылада ў французаў, але яна да гэтага часу знаходзіцца ў стадыі распрацоўкі. CornerShot — прыстасаванне для агляду і стральбы з-за вугла, створанае ветэранам ізраільскага спецназа Амосам Голанам. У канструкцыі ёсць дзве камеры (далёкага віду і fish eye для кругавога агляду), можна паставіць лазерны прыцэл, цэлаўказ або глушыцель. Выкарыстоўваць яе можна з рознай стралковай зброяй — пісталетамі, вінтоўкай і нават аднаразарадным гранатамётам. Вугал стральбы — 63 градусы: гэта дазваляе весці агонь, не падстаўляючы сябе пад варожыя кулі. Сёння CornerShot стаіць на ўзбраенні спецназа Азербайджана, Індыі, Інданезіі, Кітая, Мексікі, ЗША, Турцыі і Паўднёвай Карэі.

Менш радыкальнае рашэнне стральбы з хованкі прапануюць французскія ваенныя інжынеры: у набор пехцінца FELIN, які ў прэсе часта называлі «абмундзіраваннем салдата будучыні», уваходзіць прыцэльная прылада з камерай, якая мацуецца над ствалом вінтоўкі FAMAS. Пры выкарыстанні такой прылады салдат падстаўляе пад агонь праціўніка толькі рукі. Але ўсеагульная рабатызацыя ўсё больш і больш як быццам прымушае інжынераў забыцца пра ідэю стрэлу з-за вугла: здаецца, будучыня цяпер — за дыстанцыйна кіраванай або нават паўаўтаномнай зброяй ■

■ Ноу-хау

# ЭЛЕМЕНТАРНАЯ БУДОЎЛЯ

## Створаны першы ў свеце «малекулярны робат»

**Навукоўцы з універсітэта Манчэстэра стварылі першага ў свеце «малекулярнага робата», здольнага выконваць задачы на малекулярным узроўні, у тым ліку і будаўніцтва іншых малекул.**



Гэтыя малюсенькія робаты, памер якіх не перавышае адну мільённую долю міліметра, могуць быць запраграмаваныя на перамяшчэнне і будаўніцтва малекулярнага грузу з выкарыстаннем малюсенькага рабатызаванага маніпулятара. Кожны робат здольны маніпуляваць асобнымі малекуламі і складаецца са 150 атамаў вадароду, кіслароду і азоту. Для параўнання: трэба скласці мільярд мільярдаў такіх робатаў, каб яны сталі аднаго памеру з гранулямі солі. Робаты працуюць, пераносячы хімічныя рэакцыі ў адмысловых растворах, якімі можна кіраваць і якія можна праграмаваць для выканання базавых задач. У будучыні такіх робатаў можна будзе выкарыстоўваць у медыцынскіх мэтах, у прамысловасці і нават для стварэння малекулярных фабрык і канвеераў.

Даследаванне было апублікавана ў часопісе Nature у канцы верасня.

Прафесар Дэвід Лі, які кіраваў даследаваннем у хімічнай школе пры ўніверсітэце, тлумачыць так: «Усё рэчыва складаецца з атамаў, а яны з'яўляюцца цаглінкамі, якія фарміруюць малекулы. Наш робат — гэта літаральна малекулярны робат, сабраны з атамаў, быццам звычайны робат — з цаглінак LEGO. Робат адказвае на шэраг простых камандаў, якія праграмуюцца з дапамогай хімічных уводных навукоўцамі. Ён падобны на робатаў, якія збіраюць аўтамабілі на заводзе. Яны падымаюць панэль і пазіцыянуюць такім чынам, каб яе можна было правільна прыляпіць і пабудаваць кузаў аўтамабіля. Такім чынам, як і робат на заводзе, наша малекулярная версія можа быць запраграмавана на тое, каб па-рознаму пазіцыянаваць і заклёпваць кампаненты, ствараючы розныя прадукты, толькі ў значна меншых маштабах на малекулярным узроўні».

Плюсы памераў такіх машын у тым, што яны значна зніжаюць попыт на матэрыялы, могуць паскорыць і палепшыць пошук лекаў, значна знізіць патрабаванні да электрасілкавання і паскорыць мініяцюрызацыю іншых прадуктаў. Магчымасці прымянення малекулярных робатаў і так званых нанаасэмблераў, якія могуць быць створаны на іх аснове, надзвычай шырокія. «Малекулярная робататэхніка ўяўляе сабой найвышэйшую ступень мініяцюрызацыі машын, — адзначае прафесар Лі. — Наша мэта стварыць і зрабіць найменшыя машыны з магчымых. Гэта толькі пачатак, але мы мяркуем, што праз 10—20 гадоў малекулярныя робаты будуць паўсюдна выкарыстоўвацца на малекулярных фабрыках і зборачных лініях».

У той час як будаўніцтва і эксплуатацыя такой малюсенькай машыны — надзвычай складаныя працэсы, метады, якія выкарыстоўваюцца камандай Лі, заснаваныя на простых хімічных працэсах. «Робаты збіраюцца і функцыянуюць з выкарыстаннем хіміі. Гэта навука пра тое, як атамы і малекулы рэагуюць паміж сабой і як вялікія малекулы збіраюцца з меншых. Сапраўды гэтак жа навукоўцы ствараюць лекі і пластмасы з простых хімічных будаўнічых блокаў. Пасля таго як нанаробаты збіраюцца, імі можна кіраваць пры дапамозе ўвядзення хімічных рэчываў, якія падказваюць робатам, што і калі рабіць, быццам у камп'ютарнай праграме» ■

Матэрыялы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС. hvir@zviazda.by

■ Сучасны падыход

# ЦЯЖКІ ПЕРАЛОМ

## У краіне выконваюцца амаль усе віды аперацый пры траўмах і артапедычнай паталогіі

**У Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры траўматалогіі і артапедыі аказваецца спецыялізаваная дапамога пры траўмах, пераломах пазваночніка, таза, ніжніх і верхніх канечнасцяў. Сюды таксама накіроўваюцца пацыенты са складанымі пераломамі і ўскладненнямі з іншых абласцей. Акрамя таго, магчымасці цэнтра задзейнічаны і для аказання меддапамогі пацыентам дзевяці мінскіх паліклінік. Самыя цяжкія пацыенты дастаўляюцца сюды на рэанімабілях з усіх абласцей.**



Па амбулаторную дапамогу на прыём да ўрачоў траўматолагаў-артапедаў і хірургаў штогод звяртаецца каля 2 млн чалавек. У краіне выконваецца каля 90 тысяч аперацый, праводзіцца каля 27 тысяч пункцый і блакад.

З кожным годам расце ўдзельная вага высокатэхналагічных і складаных аперацыйных умяшанняў — эндапратэзаванняў тазасцегнавога, каленнага, локцевага, плечавога і галёнкаступнёвага суставаў, артраскапічных аперацый на суставах, аперацый на пазваночніку. Укараняюцца сучасныя тэхналогіі астэасінтэзу пры пераломах, у тым ліку з выкарыстаннем айчынных металаканструкцый, распрацаваных у цэнтры траўматалогіі.

— У нашым цэнтры дзевяць аперацыйных, у якіх можна выконваць аперацыі ў тым ліку дзецям, пачынаючы з 1—2 месячнага ўзросту, — расказвае **вядучы навуковы супрацоўнік РНПЦ траўматалогіі і артапедыі, кандыдат медыцынскіх навук, урач траўматолаг-артапед вышэйшай катэгорыі Алег КОРЗУН.** — Вось у гэтай аперацыйнай мы можам бачыць маладога пацыента, якому робяць астэасінтэз — змацаванне дзвюх касцей металічнымі канструкцыямі. Аперацыйная аснашчана маніторам, на якім хірург бачыць рэнтгенаграму. Пацыент абуджаецца адразу пасля завяршэння ўмяшання, затым яго пераводзяць на некалькі гадзін у рэанімацыю, дзе ён поўнасцю прыходзіць да прытомнасці. Аперацыя праводзіцца з мінімальнымі разрэзамі, што сёння лічыцца звычайным.

Эндапратэзаванне тазасцегнавога сустава пры пераломах выконваецца сёння і на міжраённым узроўні, дзякуючы чаму за апошнія 10 гадоў колькасць такіх аперацый вырасла па краіне амаль у 3,5 раза, а на каленных суставах — у 6. Рост умяшанняў звязаны з высокім узроўнем захваральнасці на артрыт. У Беларусі звыш 220 тысяч чалавек пакутуюць ад артрозу, з іх каля 50 тысяч знаходзяцца на дыспансерным уліку, кожны чацвёрты мае патрэбу ў эндапратэзаванні. Сярэдні тэрмін чакання аперацыі на тазасцегнавым суставе — 1,5 года, каленнага — да 2.

Да 2020 года плануецца выконваць штогод не менш за 6 тысяч эндапратэзаванняў тазасцегнавога і каля 2 тысяч каленнага суставаў.

Самыя складаныя ў тэхнічным сэнсе аперацыі — пры пераломе касцей таза, яны суправаджаюцца вялікай стратай крыві, а самыя працяглыя па часе — аперацыі пры скаліёзе (устаноўка фіксатараў па ўсёй даўжыні пазваночніка можа працягвацца ад 4 да 6 гадзін). Скаліёзы аперыруюцца прыкладна з 16 гадоў, калі закончыўся актыўны рост арганізма.

— Звычайна сталыя пацыенты з пераломамі шыйкі сцягна аперыруюцца праз 48 гадзін, аднак у снежні мінулага года мы пачалі ўкараняць новы стандарт лячэння па шпіталізацыі пацыентаў, якім аперацыйнае ўмяшанне праводзіцца ў наступныя 24 гадзіны з моманту атрымання траўмы — у першую чаргу, старэйшым за 70 гадоў, — тлумачыць **загадчыца рэанімацыйнага аддзялення Вольга РАДЗЮКЕВІЧ.** — Вядома, што чым больш часу праходзіць ад моманту траўмы, тым менш шанцаў на выздараўленне і выжыванне. Адразу пасля аперацыі ўсе трапляюць у наша аддзяленне, і літаральна праз 2—3 дні павінны стаць на ногі. Рэалізацыя праекта стала магчымай дзякуючы зладжанай рабоце цэлай брыгады спецыялістаў — хірургаў, артапедаў, тэрапеўтаў, неўролагаў, рэаніматолагаў. Мы вывучаем цяпер і праблемныя моманты ранніх умяшанняў. Як высвятляецца, некаторыя пажылыя пацыенты даволі дрэнна адаптуюцца да ўсяго, што так імкліва з імі адбылося: перелам, аперацыйная, рэанімацыя, тут жа трэба ўставаць, хадзіць, а вакол — усё незнаёмае. У ідэале брыгаду спецыялістаў неабходна дапоўніць і ўрачом-герантолагам, які дапаможа пераадолець сталаму пацыенту дэзадаптацыю, справіцца з пагаршэннем псіхічнага стану. Акрамя таго, варта ствараць рэабілітацыйныя медустановы менавіта для вось такіх цяжкіх пацыентаў. Існуючыя рэабілітацыйныя цэнтры скіраваны на аднаўленне людзей з патэнцыялам, працаздольных, а тут патрэбны асаблівы догляд ■

### Зацягнулі бацькі з аперацыяй

**У дзяцей аперыруюць сёння цэрэбральны параліч, паталогію тазасцегнавога сустава (напрыклад, прыроджаныя дысплазіі) і ступні (касалапасць, плоскаступнёвасць, выкрыўленне даўжыні канечнасцяў). Артапедычныя аперацыі выконваюцца ў тым жа аб'ёме і па тых жа паказаннях, што і ва ўсім свеце. Аднак ёсць і невылечныя прыроджаныя захворванні, напрыклад, недасканалы астэагенез, ломкасць касцей. Дзіцяці, якое ўжо мае больш за сотню пераломаў, штораз іх вылечваюць, аднак захворванне само па сабе нікуды не знікае.**

**Штогод у РНПЦ траўматалогіі лечацца каля 2,5 тысячы пацыентаў да 18 гадоў. 35—40 працэнтаў з іх атрымліваюць хірургічнае лячэнне. Самае важнае, не цягнуць са зваротам, калі ў дзіцяці праблема са здароўем. Як правіла, бацькі гэта разумеюць, але ж прыгадваюць спецыялісты і такі выпадак, калі яны паставілі гадавалай дзяўчынцы з раёна дыягназ «дысплазія» і рэкамендавалі неадкладную аперацыю, а бацькі прывезлі дзіця... праз пяць гадоў. Сказалі, часу не было.**

■ Набалела!

# САМІ СУПРАЦЬ СЯБЕ?



Ніне Анатолеўне за 70. У кардыялагічнае аддзяленне яна трапіла з гіпертанічным крызам — гэта калі так званы верхні ціск дасягае 200 мм рт. сл. Літаральна за тры дні яе паставілі на ногі — артэрыяльны ціск нармалізаваўся. Больш за тое, правялі шмат нятанных відаў абследаванняў. Усё аказалася ў норме. А лечачы ўрач так і сказала: калі б вы, шаноўная спадарыня, паспрабавалі гэтак абследавацца за сваю пенсію, то... Адным словам, ніякай пенсіі Ніне Анатолеўне не хапіла б. І яна гэта разумее. Выглядае нібы ўдзячнай. Але мне цікава, адкуль жа ўзяўся рэзкі скачок. Аказалася, шмат гадоў таму пацыентка перанесла інфаркт і з таго часу ўжывае цэлы шэраг прызначаных лекавых прэпаратаў. І тут высвятляецца, што не ўжывае, а павінна ўжываць. Бо апошнім часам яна падумала адмовіцца ад... стацінаў! Гэта цэлая група лекаў, якія зніжаюць колькасць халестэрыну ў крыві. Не сакрэт, што халестэрын бывае «добры» і «дрэнны». Лекі-стаціны скіраваны на змяншэнне колькасці менавіта «дрэннага». Высокія яго значэнні ўказваюць на такое захворванне, як атэрасклероз. А ён, у сваю чаргу, разам з высокім артэрыяльным ціскам прыводзіць да ішэмічнай хваробы сэрца і ўрэшце да інфаркту міякарда або інсульту галаўнога мозга.

«У мяне ад гэтых стацінаў галава баліць, добра будзе і без іх», — кажа Ніна Анатолеўна. Сапраўды, усе лекі, і гэтыя не выключэнне, маюць пабочныя эфекты. Сярод іх у тым ліку галаўны боль і іншыя непрыемнасці. Здараюцца яны далёка не ва ўсіх, і калі з'яўляюцца, трэба гэта абмяркоўваць са сваім урачом, каб той шукаў у вялікім арсенале лекаў тое, што падыходзіць найлепшым чынам. Аднак на практыцы пацыенты аказваюцца самі сабе дактарамі. Памяншаюць дозу прэпарату, а затым і наогул па-ціхаму адмаўляюцца ад прыёму. А пасля ў нас урачы аказваюцца вінаватымі — не пераканалі, не данеслі інфармацыю... Пэўна, гіпертанічны крыз добра данёс.

У кардыялагічным аддзяленні іншай клінікі можна бачыць на абследаванні адразу некалькі маладых хлопцаў прызыўнога ўзросту. Ім тут вымяраюць артэрыяльны ціск і ўсё той жа ўзровень халестэрыну. Здаецца, які там халестэрын у 17 гадоў?! Аказваецца яшчэ які, дый не тое што ў 17... Тыя ж стаціны «ад халестэрыну» сёння прызначаюць ужо з 8 гадоў! Калі ў дзіцяці — дрэнная спадчыннасць, у кагосьці з бацькоў быў ранні інфаркт міякарда або інсульт (у жанчын — да наступлення 55 гадоў, у мужчын — да 60 гадоў). Такая сямейная гіперхалестэрынемія можа забяспечыць дзіцяці вельмі высокі ўзровень халестэрыну — ад 8 мм/л. Займаюцца такімі пацыентамі педыятры разам з дарослымі кардыёлагамі — так сёння пачынаючы з дзіцячага ўзросту выяўляюцца групы рызыкі. Выяўляць іх выяўляюць, але што далей? Мяркуючы па тых, каго можна бачыць у клініцы, не ўсе бацькі ўсведамляюць, наколькі важна не проста выявіць, але і займацца прафілактыкай сардэчна-сасудзістай паталогіі. А пакольк не ўсведамляюць, то вось вам у 17 гадоў і ярка выражаныя гіпертонікі.

— Штогод праз наша аддзяленне праходзіць ад 70 да 100 маладых людзей з ліку прызыўнікоў, — расказвае **загадчыца інфарктнага аддзялення №2 10-й мінскай гарадской клінічнай бальніцы, урач-кардыёлаг вышэйшай катэгорыі Наталля ПАЛЯЎКОВА.** — Вайсковая ўрачэбная камісія накіроўвае да нас на даабследаванне, калі ёсць падазрэнні або ўжо з пастаўленым дыягназам артэрыяльнай гіпертэнзіі, анамаліямі развіцця сэрца — хордамі, пралапсамі... У палове выпадкаў маладыя людзі з павышаным ціскам маюць атлусценне. Мы высвятляем, з чым гэта звязана — з гарманальнымі парушэннямі або нерацыянальным харчаваннем і нізкай фізічнай актыўнасцю. Калі праблема носіць гарманальны характар, даём накіраванне да ўрача-эндакрынолага. Калі выяўляюцца нейкія іншыя парушэнні здароўя, то ў залежнасці ад паталогіі накіроўваем да неўролага, гастраэнтэролага... Праз два тыдні комплекснага абследавання даём рэкамендацыі па лячэнні, якое павінна ажыццяўляцца па месцы жыхарства...

Выпіскі накіроўваюцца як у ваенкамат, так і ў паліклініку, дзе ўчастковы тэрапеўт павінен працягваць лячэнне. Практыка паказвае, што лячыць хлопцы, мякка кажучы, не спяшаюцца. Праходзіць дапрызыўнае медабследаванне неабходна кожны год, аж да наступлення 27-гадовага ўзросту, а таму спяшацца палепшыць свае паказчыкі — не рэзон. Хлопцы трымаюцца за свае паталогіі рукамі і нагамі. Прычым у прамым сэнсе.

Чым вышэйшая ступень захворвання, тым для хлопцаў, аказваецца, лепш. Хтосьці атрымлівае адтэрміноўку на паўгода-год, нехта адразу на тры. А за гэты час можна пастарацца жыць так, каб захворванне пачало прагрэсіраваць, развіўся ўскладненні.

Я гляджу на аднаго такога пацыента на калідоры клінікі і спрабую зразумець... Не, я адмаўляюся гэта разумець! Сёння армія для маладога чалавека — не зло. Усё ж такі не савецкія часы. Мае знаёмыя, што нядаўна прайшлі гэту школу жыцця, вельмі выгадна адрозніваюцца ад тых, хто такой загартоўкі не атрымаў. Гэта першае. Па-другое, пазбягаць арміі цаной свайго здароўя — вы мне выбачайце...

Як атрымалася, што ў нашым грамадстве павырастала пакаленне мужчын, гатовых стаць хронікамі і інвалідамі ўжо літаральна пасля 30, пазбавіць сябе магчымасці як мага даўжэй дапамагаць сваім бацькам? Няўжо сапраўды моладзь думае, што трапіць у хуткай будучыні з прычыны інфаркту на аперацыйны стол або расціць хворых дзяцей (а адкуль узяцца здаровым у хворага таты?) — больш выйгрышна ў параўнанні са службай у арміі? Няўжо і гэтыя пасля асмеляцца сказаць, што ім ніхто не растлумачыў, не папярэдзіў, не засцярог? ■

■ Псіхалогія для ўсіх

# Пра сон і псіхіку

**Сон аднаўляе сілы пасля разумовай і фізічнай працы. Аднак гэта не проста адпачынак, а актыўны стан арганізма з асаблівай формай дзейнасці мозга: мы аналізуем і перапрацоўваем інфармацыю, назапашаную за папярэдні час. Калі такое сартаванне аказваецца паспяховым, мозг вызваляецца ад празмернай інфармацыі і зноў гатовы да работы. Дзякуючы гэтаму нармалізуецца нервова-псіхічны стан, аднаўляецца працаздольнасць.**



— Сон складаецца мінімум з дзвюх вялікіх стадый, якія заканамерна і цыклічна змяняюць адна адну: сон павольны, працягласцю 60—90 хвілін, і сон хуткі — 10—20 хвілін, — расказвае **ўрач-псіхатэрапеўт Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Іна ЦЕЛЕШ.** — За хуткі адказваюць больш глыбокія структуры мозга, і ў малых дзяцей ён дамінуе. З узростам павялічваецца доля павольнага сну, які арганізаваны больш складана. Доўгі час лічылася, што пазбаўленне чалавека менавіта хуткага сну цяжэй адбіваецца на здароўі. Але гэта не так. Асноўнае значэнне мае нармальная структура сну — суадносіны павольнай і хуткай фаз. Калі гэтыя суадносіны парушаюцца (што адбываецца, напрыклад, падчас прыёму снатворных прэпаратаў), то сон, нават працяглы, не прыносіць чаканага адпачынку...

Калі сон скарачаецца і мы не высыпаемся, узнікаюць неўратычныя парушэнні. Калі недасыпанне рэгулярнае, гэтыя змяненні паступова назапашваюцца, што пагражае цяжкімі функцыянальнымі захворваннямі.

Пасля напружанай разумовай або фізічнай працы патрабуецца больш працяглы сон. Галоўнай умовай паўнацэннасці сну з'яўляецца яго бесперапыннасць, якая стварае ў мозгу аптымальныя ўмовы для перапрацоўкі назапашанай за дзень інфармацыі. У сне вызваляюцца рэзервы памяці, сціраюцца непатрэбныя звесткі, выдаляюцца непатрэбныя рэакцыі, сфарміраваныя днём.

**Вельмі спрыяльна на структуры сну адбіваецца звычка класціся і ўставаць у адзін і той жа час. Разумовая праца ў позні час сутак спачатку парушае сон, а затым прыводзіць да паталогіі.**

Увечары неабходна пазбягаць эмацыянальнай дзейнасці — нельга дапускаць канфліктаў, не варта глядзець тэлеперадачы, якія моцна ўзрушваюць. Рэкамендуецца пазбягаць танізуючых напояў, цяжкай ежы. Карысная будзе вячэрняя прагулка.

Тым, хто дрэнна спіць ноччу, не варта класціся днём, але павялічыць працаздольнасць некаторым дапамагае кароткі, да паўгадзіны, дзённы сон у перапынках паміж напружанай разумовай дзейнасцю ■

Матэрыялы падрыхтавала
Святлана БАРЫСЕНКА. protas@zviazda.by

# ААТ «НЯСВІЖСКІ ЗАВОД

ААТ «Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў» — сучасная фармацэўтычная арганізацыя, якая спецыялізуецца на вытворчасці стэрыльных інфузійных і ін'екцыйных раствораў, раствораў для вонкавага ўжывання.
На прадпрыемстве дзейнічаюць тры вытворчыя ўчасткі, на якіх ажыццяўляецца выпуск раствораў у поліэтыленавых бутэльках «Bottlepack», ПВХ-кантэйнерах, шкляных бутэльках.
Вытворчасць лекавых сродкаў у поліэтыленавых бутэльках «Bottlepack», ПВХ-кантэйнерах і шкляных бутэльках адпавядае патрабаванням Належнай вытворчай практыкі, што пацверджана адпаведнымі сертыфікатамі.
У асартыментным партфелі арганізацыі 37 найменняў лекавых сродкаў, з улікам дазіровак і формаў выпуску вырабляецца 105 відаў прэпаратаў, у тым ліку:
— па тэхналогіі «Bottlepack» — 27 найменняў;
— у ПВХ-кантэйнерах — 20 найменняў;
— у шкляных бутэльках — 58 найменняў.
Праектныя магутнасці прадпрыемства дазваляюць штогод выпускаць 31 000 000 флаконаў, у тым ліку:
— па тэхналогіі «Bottlepack» — 12 500 000 паліэтыленавых бутэлек;
— у ПВХ-кантэйнерах — 6 500 000 кантэйнераў;
— у шкляных бутэльках — 12 000 000 бутэлек.
Прадукцыя прадпрыемства зарэгістраваная і экспартуецца ў Рэспубліку Азербайджан, Рэспубліку Туркменістан, Рэспубліку Казахстан, Расійскую Федэрацыю.


ЖЫВЕНЬ Генадзь Адольфавіч. Дырэктар арганізацыі.


КАРЖАНЕЎСКАЯ Таццяна Міхайлаўна. ЦЯРПІЦКАЯ Алена Мікалаеўна. Машыністы расфасовачна-ўпаковачных машын цэха медыцынскіх прэпаратаў і іншай прадукцыі.


ШЫБУТ Кацярына Сяргееўна. Мікрабіёлаг аддзела кантролю якасці.


КРЭНЬ Вікторыя Ігараўна. Хімік аддзела кантролю якасці.


МАРХЕЛЬ Аксана Аляксандраўна – машыніст расфасовачна-ўпаковачных машын цэха ІРП.

# МЕДЫЦЫНСКІХ ПРЭПАРАТАЎ»



ПАНОВА Наталля Вячаславаўна, РОЎБА Вольга Аляксандраўна. Хімікі аддзела кантролю якасці.



БЯЛЕВІЧ Сяргей Мікалаевіч. Апаратчык шырокага профілю вытворчасці хіміка-фармацэўтычных прэпаратаў цэха медыцынскіх прэпаратаў і іншай прадукцыі.



ДУБАТОЎКА Алена Васілеўна – апаратчык шырокага профілю вытворчасці хіміка-фармацэўтычных прэпаратаў цэха ІРП



ШЫМАНСКІ Павел Іванавіч. Апаратчык стэрылізацыі цэха медыцынскіх прэпаратаў і іншай прадукцыі.



ІГНАТЧЫК Лілія Уладзіміраўна. Дазіроўшчык медыцынскіх прэпаратаў цэха медыцынскіх прэпаратаў і іншай прадукцыі.



СІТНІКАВА Кацярына Уладзіміраўна – машыніст расфасовачна-ўпаковачных машын цэха ІРП.



КАПЫТКО Аляксандр Валер'евіч – дазіроўшчык медыцынскіх прэпаратаў цэха ІРП.



ЧАРНАБАЙ Вера Леанідаўна. Дазіроўшчык медыцынскіх прэпаратаў цэха медыцынскіх прэпаратаў і іншай прадукцыі.



КОМЛАЧ Валерый Уладзіміравіч – апаратчык аддзялення водападрыхтоўкі цэха ІРП.

УНП 600311156

## Извещение о проведении первого и повторного открытых аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, тел. (0212) 472056.

Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды

Лот №1. Право заключения договора аренды сроком на 99 лет земельного участка с кадастровым №221085404001000035 площадью 0,2566 га по адресу: Витебская обл., Верхнедвинский р-н, Освейский с/с, д. Изубрица для строительства объекта «Усадьба народного быта и старинных технологий в н.п. Изубрица Верхнедвинского района Витебской области». Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (р. Изубрица), земли в придорожных полосах (контролируемых зонах) автомобильных дорог. **Нач. цена**: 416,81 руб. **Задаток:** 41,68 руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY41AKBB36003130006140000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04002. Получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Верхнедвинский райисполком)

**Дата, время и место проведения аукциона:** 13.11.2017 в 09.00 по адресу: г.Верхнедвинск, ул. Кооперативная, 1, в Верхнедвинском райисполкоме**. Срок внесения задатков и приема документов:** с 10.10.2017 с 8.30 по 10.11.2017 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в рабочие дни с 8.30 до 17.30 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Победитель аукциона (единственный участник несостоявшегося аукциона) обязан (условия аукциона):** возмещение потерь сельскохозяйственного производства в сумме 696,67 руб.; в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся: внести плату за право заключения договора аренды зем. участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения; не позднее двух рабочих дней после внесения денежных выплат обратиться в Верхнедвинский райисполком за заключением договора аренды зем. участка; в течение 2 месяцев со дня подписания договора аренды зем. участка, но не позднее 3 месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обратиться в организацию по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним за гос. регистрацией права на зем. участок; получить в установленном порядке разрешение Верхнедвинского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий одного года; в течение 6 месяцев со дня утверждения проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем. участка (начать строительство); осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией и согласованные с Верхнедвинским райисполкомом; снять, сохранить плодородный слой почвы из-под габаритов строений и использовать его для благоустройства территории. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 16 15 – зем. участок для размещения объектов культурно-просветительного и зрелищного назначения

Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды

Лот №1. Право заключения договора аренды сроком на 99 лет земельного участка с кадастровым №224685008101000047 площадью 0,2492 га по адресу: Витебская обл., Толочинский р-н, Славновский с/с, д. Молявка, ул. Центральная, 15, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения: водоохранная зона рек и водоемов (р. Плиса), в охранных зонах электрических сетей напряжением свыше 1000 В. Нач. цена: 219,63 руб. Задаток: 21,96 руб.

Лот №2. Право заключения договора аренды на 99 лет земельного участка, кадастровый №224650100003000633, площадь 0,1473 га, адрес: Витебская обл., Толочинский р-н, г. Толочин, ул. Дорожная, 61А, для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Нач. цена**: 5 037,72 руб. **Задаток:** 503,70 руб.

Лот №3. Право заключения договора аренды на 99 лет земельного участка, кадастровый №224650100003000636, площадь 0,1228 га, адрес: Витебская обл., Толочинский р-н, г. Толочин, ул. Тюменская, 2 для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Нач. цена**: 4 199,81 руб. **Задаток:** 420 руб.

**Дата, время и место проведения повторных аукционов:** 10.11.2017 в 16.00 по адресу: г. Толочин, ул. Ленина, 1, в Толочинском райисполкоме. **Срок внесения задатка и приема документов:** с 10.10.2017 с 8.30 по 09.11.2017 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Реквизиты для внесения задатка: по лоту №1:** р/с BY44AKBB36003270795430000000 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04002. Получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Славновский сельисполком); **по лотам №2, №3:** р/с BY84AKBB36003270095710000000 ОАО «АСБ «Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04002. Получатель платежа: ГУ МФ по Витебской области (Толочинский райисполком). Для участия в аукционе приглашаются граждане, негосударственные юр. лица Республики Беларусь, консолидированные участники (двое и более граждан, негосударственных юр.лиц Республики Беларусь). **Условия аукциона:** победитель аукциона (претендент на покупку) обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся внести плату за предмет аукциона; **по лоту №1:** не позднее 2-х рабочих дней после внесения денежных выплат и выполнения условий, указанных в протоколе аукциона либо в протоколе признания аукциона несостоявшимся заключить со Славновским сельисполкомом договор аренды зем. участка; в течение 2-х месяцев со дня заключения договора аренды зем. участка обратиться за гос. регистрацией зем. участка и прав на него в Толочинское бюро Оршанского ф-ла РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; получить разрешительную документацию на строительство жилого дома в Толочинском райисполкоме; в течение одного года со дня получения свидетельства (удостоверения) о гос. регистрации создания зем. участка и возникновения права на него приступить к занятию зем. участка в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство); до начала строительства снять плодородный слой в местах размещения строений и сооружений и использовать его на улучшение приусадебного зем. участка; по окончании срока аренды зем. участка совместно со Славновским сельисполкомом решить вопрос его дальнейшего использования; **по лотам №2, 3:** не позднее 2-х рабочих дней после внесения денежных выплат заключить с Толочинским райисполкомом договор аренды зем. участка; в течение двух месяцев со дня заключения договора аренды зем. участка обратиться за гос. регистрацией зем.участка и прав на него; по окончании срока аренды зем. участка совместно с местным исполкомом решить вопрос его дальнейшего использования; получить разрешительную документацию на строительство жилых домов в Толочинском райисполкоме; до начала строительства снять плодородный слой в местах размещения строений и сооружений и использовать его на улучшение приусадебного зем. участка; в течение 6 месяцев (для юр. лиц) и 1 года (для физ. лиц) со дня получения свидетельства (удостоверения) о гос. регистрации зем. участка приступить к занятию зем. участка (начать строительство); закончить строительство жилого дома в течение 3-х лет с даты осуществления гос. регистрации права на зем. участок. Назначение зем.участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме).

Аукционы проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за предмет аукциона и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Для участия в аукционе граждане, индивидуальные предприниматели, консолидированные участники и юр. лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный срок подают заявление на участие в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, с отметкой банка, заключают соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; представителем иностранного юр. лица – легализованные копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык, легализованные доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о фин. состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; консолидированными участниками представляются оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов предъявляется документ, удостоверяющий личность. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by

## РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 23 октября 2017 г. в 10.00 повторного открытого аукциона со снижением начальной цены на 48% после очередных несостоявшихся торгов по продаже объектов недвижимости и иного имущества (лот №1), расположенных по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Молодежная, 3А, принадлежащих Совместному открытому акционерному обществу «Речицапиво» на праве собственности

**Состав лота:**

**Здание главного производственного корпуса с силосными корпусами,** инв. №340/С-300667. Общая площадь 21754,0 кв. м. *Составные части и принадлежности: две пятиэтажные пристройки, пристройка, подвал под основным зданием, сусловое отделение, солодовенное отделение, два крыльца, подсилосное отделение, подработочное отделение, силосные корпуса, здание весов, навес.* **Часть здания – 2 359,4 кв. м – сдана в аренду сроком до 31.12.2017 г.**

**Здание подсобного корпуса,** инв. №340/С-300672. Общая площадь 2452,3 кв. м **Часть здания – 1 662,5 кв. м – сдана в аренду сроком до 31.12.2017 г.**

**Здание пункта санобработки и заправки пивцистерн,** инв. №340/С-300660. Общая площадь 158,0 кв. м **Здание сдано в аренду сроком до 31.12.2017 г.**

**Здание автогаражей**, инв. №340/С-300664. Общая площадь 443,5 кв. м. *Составные части и принадлежности: склад.* **Здание сдано в аренду сроком до 31.12.2017 г.**

**Здание станции обезжелезивания,** инв. №340/С-300662. Общая площадь 197,6 кв. м. *Составные части и принадлежности: отмостка.*

**Здание гаражей,** инв. №340/С-300661. Общая площадь 208,0 кв. м *Составные части и принадлежности: навес.* **Здание сдано в аренду сроком до 31.12.2017 г.**

**Здание склада тары,** инв. №340/С-300665. Общая площадь 1002,0 кв. м. *Составные части и принадлежности: рампа, навес.* **Здание сдано в аренду сроком до 31.12.2017 г.**

**Здание склада для хранения сахара,** инв. №340/С-300658. Общая площадь 1044,1 кв. м

**Здание склада модуля,** инв. №340/С-300653. Общая площадь 955,7 кв. м. *Составные части и принадлежности: кирпичная пристройка.* **Здание сдано в аренду сроком до 31.12.2017 г.**

**Здание проходной с автовесами,** инв. №340/С-300656. Общая площадь 127,1 кв. м. *Составные части и принадлежности: крыльцо, весовая*

**Здание административно-бытового корпуса с галереей,** инв. №340/С-27764. Общая площадь 1864,0 кв. м *Составные части и принадлежности: переходная галерея, три крыльца.* **Часть здания – 200,0 кв. м – сдана в аренду сроком до 31.12.2017 г.**

**Здание мазутонасосной,** инв. №340/С-300651. Общая площадь 66,1 кв. м. *Составные части и принадлежности: крыльцо*

